Міжкультурнае Гродна ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Міхась Забэйда ☞ 9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 27 (2825) Год LV | Беласток, 4 ліпеня 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

Купалле пачалося

Калектыў „Каліна” паявіўся на Купаллі ў Залуках у новых строях

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Пяцігоддзе Згуртавання „Залукі над Супраслю”, завяршэнне праекта Гарадоцкага цэнтра культуры, новыя, выкананыя паводле „тутэйшых” узораў строі калектыву „Каліна” ну і, вядома, карагод ды пусканне вянкоў на раку Супрасль звярнулі ўвагу ў час сёлетняга купальскага фэсту ў Залуках Гарадоцкай гміны. Гэтым самым на Беласточчыне пачаўся купальскі сезон.

Купалле ў Залуках арганізуецца з 2004 г. Як сказаў „Ніве” ў час фэсту суарганізатар Юры Хмялеўскі, дырэктар ГЦК, упісалася яно ўжо пастаянна ў каляндар культурных мерапрыемстваў гміны і мае сваіх пастаянных і верных аматараў.

— Не без прычыны гэтая імпрэза працягваецца столькі гадоў. Можа працягвацца, таму што ёсць умовы. Гэтымі „ўмовамі” з’яўляецеся вы, — звярнуўся да соцень гледачоў войт Гарадка Веслаў Кулеша.

— Гэтая купальночка крыху іншая, таму што ў яе свойская, вясковая атмасфера, — падкрэсліў дырэктар ГЦК.

Непадалёк сцэны кідаўся ў вочы драўляны домік, пабудаваны ў тэрміновым парадку сталяром Яраславам Варановічам. Гэтая хатка і тое, што ў ёй апынулася, з’яўляецца вынікам праекта ГЦК „З прабабулінага куфра”. Тут можна пабачыць м.інш. уручную гафтаваныя ручнікі, стары куфар, драўляны ложак з памятаючым бабулін час пакрывалам. Галіна Парфянюк-Дробат вязала кручком, а Валянціна Паплаўская паказвала, як калісь пралі на драўляным калаўротку. 71-гадовая спадарыня Галіна расказвала нам:

— Ад шасці гадоў жыву ў Гарадку, ды ўсё ж вельмі прывязаная да Залук. Мы самі вышывалі гэтыя ручнікі. Узоры бралі з „Нівы”.

75-гадовая спадарыня Валянціна, працы, як наказвае традыцыя, у завязанай пад барадой хустцы:

— Я была ў „Каліне” ад пачатку, ад амаль дванаццаці гадоў. Засноўвала яе. Было тады ў калектыве толькі шэсць асоб. Адышла, ужо цяпер зацяжка. Мы самі шылі строі.

Паказваючы прадметы, сабраныя ў хатцы:

— Цяпер маладыя толькі за камп’ютарам, не ведаюць, што да чаго было. Маладыя не памятаюць, што калісьці сам чалавек праў, вышываў, гафтаваў. Сёння яны за гэта не бяруцца.

Спадарыня Галіна:

— Калісьці дык людзі без граша былі, і неяк жылі. Тут відаць, як можна было даваць сабе рады.

Абедзве жанчыны паказваюць матавіла, капаньку — малую драўляную ваненку для мыцця дзяцей — і калыску:

— Гэтая калыска яшчэ з царскага часу. Нават калочкі ў ёй драўляныя.

Найважнейшае, вядома, у час залуцкага купалля было пусканне вянкоў і вылоўліванне іх хлапцамі. Адна з мясцовых жанчын (яшчэ дзеўка), што перад залуцкай сцэнай пляла вянок яшчэ ў час канцэрта, крыху шкадавала: „Сёлета было менш квецця на лугах. Было замокра”.

Перад пускам вянкоў вельмі шаноўна на сцэне прэзентаваўся калектыў „Каліна”. Паявіўся ён у новых строях. Неўзабаве жанчыны з калектыву будуць выступаць у новых чэпчыках і ўсе, разам з парай мужчын, таксама ў новых ботах.

Марыянна Апановіч, сяброўка „Каліны”:

— Усе гэтыя гафты выкананы ўручную. Узоры на спаднічках тутэйшыя; ёсць мак, васілёк, ну і ягадкі каліны, бо ж наша назва — „Каліна”. Спадніцы ў нас клятчатыя, як калісьці з саматканкі. На адным з мерапрыемстваў жанчыны ў сваіх строях селі побач сябе, дык было відаць, што ўсе строі амаль такія самыя, з нашыванымі ўзорамі. Мы хацелі вылучыцца, мець строі іншыя ад гэтых шытых на машынах. Узор на нашы строі запраектавала Марыся Мялешка з Дома культуры ў Гарадку. Чэрпала помыслы з ручнікоў, якія ў дамах віселі пры іконах. Шыла іх Ірэна Карповіч з Гарадка. А фундаваў іх Гарадоцкі цэнтр культуры.

Дырэктар Хмялеўскі:

— Цяпер усе калектывы на Беласточчыне вельмі калярова апрануты. Усе касцюмы вельмі на сябе падобныя, усе пашыты ў адным месцы — у мінскай фабрыцы. На жаль, яны пашыты так, што ніяк не спасылаюцца на нашу традыцыю.

Ангажавалася ў арганізацыю Купалля ў Залуках м.інш. Ірэна Супрун, дырэктарка тутэйшай Непублічнай пачатковай школы, адзінай такой ва ўсёй Гарадоцкай гміне, вядзенне якой магчымае дзякуючы стараням Згуртавання „Залукі над Супраслю”. У размове з „Нівай” пані Ірэна вельмі ганарылася:

— У нашу школу ходзіць трыццаць дзяцей. Усе вывучаюць беларускую мову.

Якраз тыя дзеткі паказалі тэатральныя сцэнкі, якія выклікалі сярод гледачоў шмат радасці. На сцэне выступіла каля дзесяці калектываў, не толькі з Залук („Каліна”, „Калінка”), але і таксама м.інш. маладзёжны з Беластока („Луна”), з Чорнай-Беластоцкай (польскамоўная „Чорная ягада”) ці з Орлі — „Вэрвочка” (які выконвае песні вельмі гарманічна).

Ужо неўзабаве купальночкі будуць арганізавацца ў іншых мясцовасцях Беласточчыны. Не будзе такой у Орлі. Дырэктарка Арлянскага дома культуры Анна Несцярук (прыехала з „Вервачкай”) тлумачыла нам:

— Ездзім на іншыя Купаллі. Іх вельмі шмат: тут, у Белавежы (ужо 3 ліпеня — М. Х.), Нарве, Нараўцы, Чыжоўскай гміне.

Зоркай залуцкага Купалля быў гурт „Прымакі”, а да танцаў іграла дыскапольная група „Рэспект” з Беластока.

Свіслач • Гародня • Ваўкавыск • Шчучын • Гайнаўка • Высокае • Масты • Рыбалы • Сямятычы • Бельск-Падляшскі • Беласток

98,1 FM

БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ РАЦЫЯ

www.racyja.com

Душы на газ ☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

У Беларусі з Расіяй чарговы газавы канфлікт. Так называецца — газавы. Насамрэч ніякім газам там і не пахне. Газу ў Расіі столькі, што яна можа атруціць ім увесь свет, задарма, нават грошай не возьме. Нафты таксама багата, ну, адпаведна, і грошай. Там столькі грошай, што ніхто не можа іх палічыць. Дарэчы, ніхто і не лічыць. Навошта іх лічыць? Ды да такой сумы далічыць там ніхто і не ўмее...

Львоўская імпрэсія ☞ 2

Ілона КАРПЮК

У чаканні Беларусі ☞ 4

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

9 770546 196000

Душы на газ

У Беларусі з Расіяй чарговы газавы канфлікт. Так называецца — газавы. Насамрэч ніякім газам там і не пахне. Газу ў Расіі столькі, што яна можа атруціць ім увесь свет, задарма, нават грошай не возьме. Нафты таксама багата, ну, адпаведна, і грошай. Там столькі грошай, што ніхто не можа іх палічыць. Дарэчы, ніхто і не лічыць. Навошта іх лічыць? Ды да такой сумы далічыць там ніхто і не ўмее.

Чаму тады, калі грошай так шмат, людзі там жывуць так кепска? А гэта не ад недахопу грошай у дзяржаве. Гэта старая расійская традыцыя — краіна павінна быць багатай, а людзі беднымі. Зразумела, што не ўсе. Некаторыя людзі маюць права быць багатымі. Але яны вызначаюцца нават не адсоткам ад агульнай колькасці насельніцтва, а канкрэтнымі прозвішчамі.

А Беларусь рускія лічаць сваёй тэрыторыяй. Таму мяркуюць, што і ў нас павінны быць адны жабракі, якія з працягнутай рукой і на каленях мусяць паўзці да Крамля. Наш начальнік некалі так і заявіў, што ён на каленях у Маскву папаўзе, калі гэта будзе патрэбна і з эканамічнай кропкі гледжання выгадна.

З таго часу прайшлі гады, і на каленях поўзаць расхацелася, асабліва перад маскалямі. Па-першае, таму, што не хочацца. Па-другое, няма перад кім. Па-трэцяе, стала прыемна думаць, што мы тут самі сабе шляхта і начальнікаў з Крамля нам не трэба. А самае галоўнае, стаў відавочны той факт, што рускія не толькі могуць паставіць каго хочуць на трон былых савецкіх рэспублік, але і скінуць з яго таксама могуць. Для іх гэта тое самае, што плюнуць. Ім усё адно, у карты гуляць, ці ў прэзідэнтаў сяброўскіх краін.

Яскравы прыклад — Курманбек Бакіеў. Захацелі — зрабілі прэзідэнтам. Захацелі — знялі. Думалі, таму не будзе куды дзецца. Але не туды тое.

З тае маскоўскае дурноты іншыя начальнікі былых савецкіх рэспублік успрынялі гэта з папраўкай на свой адрас. Ніяк не могуць прывыкнуць да расійскага дэбілізму. Напалохаліся, што і іх чакае нешта падобнае. Таму Бакіеў не прапаў, а асеў у Беларусі, дзе яму было прадстаўленае жыллё, медыцынская абслуга і іншыя камфортныя рэчы, якіх звычайныя грамадзяне Беларусі нават і прысніць баяцца.

І вось тут раз'юшаныя гаспадары Крамля вырашылі пакараць непаслухмянае беларускае кіраўніцтва. І доўга не думалі, толькі зрабілі як заўсёды — перакрылі газ. Ну і атрымалі як заўсёды. Атрымалася так, што перакрылі саміх сабе. Сказалі Беларусі заплаціць грошы, а прыйшлося плаціць самім. У дадатак яшчэ і прэзідэнт Азербайджана Ільхам Аліеў паказаў Маскве, што пралетарыі ўсіх постсавецкіх краін могуць аб'яднацца супраць імперыялістаў, і даў начальніку беларускай дзяржавы грошы, каб той мог махануць імі ў твар крамлёўскім гаспадарам.

Праўда, не ўсе былыя саюзныя рэспублікі адрэагавалі такім чынам. Януковічаўская Украіна адразу заняла бок Масквы, і чарговы раз бяздумна паўтарыла галоўную памылку мінулага, крыху па-іншаму вымавіўшы былую ганебную фразу: „Навекі з Расіяй..." Праўда, гэтым разам фраза прагучала яшчэ больш фальшыва, і наблізілася да цынічнай: „Нічога асабістага, толькі бізнес". З гэтымі словамі януковічаўцы прапанавалі Расіі транспартаваць газ у Еўропу па іх трубах, мінаючы Беларусь, ну, адпаведна, і не плаціць Беларусі за транзіт блакітнага паліва.

А Беларусь сказала плаціць. І рускія заплацілі. Яны заўсёды плацяць, калі ім кажуць плаціць і ніколі не плацяць, калі ў іх гэтага не патрабуюць.

У гэтым чарговым супрацьстаянні ўсё было як заўсёды. Усе бакі сказалі і зрабілі тое, што хацелі. Толькі адзін палітычны суб'ект застаўся бязмоўным. Гэта беларуская апазіцыя. Яна ўжо мае столькі прэтэндэнтаў на прэзідэнцкае крэсла, што гэтая колькасць хутка перакрочыць колькасць выбаршчыкаў. Мае столькі эканамічных праграм, колькі не мае астатняя частка планеты. А вось наконт газу разумныя эканамісты так і не выказаліся.

А гэта быў якраз той момант, калі на газ павінны былі душыць усе. Кожны па-свойму, так як лічыць неабходным, але абавязкова выказацца. Але прамаўчалі, забаяліся. Не занялі не толькі чыйгоці боку, але і свайго не адстаялі. Як яны, з такой „смеласцю" перамагаць думаюць...

Віктар САЗОНАЎ

Львоўская імпрэсія

На вуліцы, перш за ўсё ў цэнтры, захапляешся элегантнасцю лініі будынкаў ды штодзённасцю няроўных, стомленых жыццём вуліц. Гарызонт перасякаюць табе ўвесь час трамваі, якія па-дзіцячаму паяўляюцца і знікаюць, жартоўна, несур'ёзна: ёсць — няма, ёсць — няма. Хочаш выцягнуць руку і толькі пагладзіць іх, калі мінаюць цябе так блізка-блізка. Той Львоў такі рамантычны. Але гэты рамантызм нябачна абдымае толькі стары горад. Убачыш яго, калі пасля дажджу глянеш на неба, а дахі камяніц пачнуць заліваць апошнія перад захадам промні сонца.

— 40 грывень?

— 50 і яшчэ падарунак!

Добра, слабы з мяне негацыянт. З другога боку 50 грывень за дзве чаркі віна не так і шмат у рэстаране. Усярэдзіне іграла музыка, а на тэрасе стаялі лужы вады, ад дробнага, ачышчаючага гарачую нядзелю дажджу, і адбівалі кшталты акружаючых зруйнаваных сцен вялікай сінагогі. Менавіта ў той момант усе будынкі пачалі мяняць колеры з халодных, пахаваных у цяні, цагляных на цёпла-залацістыя. Музыка надалей іграла, а жыдоўскі рэстаранчык на старым горадзе Львова запаўняўся прыхільнікамі кашэрнай кухні.

Два магніты з выявай жыдоўскага Львова ў выніку няўдалага таргавання сталі ўказальнікам у падарожжы па сучасным Львове: глядзець на яго як на развіваючыся горад ды шукаць адначасова ў пахаваных дварах слядоў яго старажытнасці. Аказваецца гэта так простае, што ажно здзіўляе. Увесь час заглядаеш у дызайнерскія кафэшкі, клубы і рэстараны, якіх тут шмат. І не гаворка тут пра найдаражэйшыя, надзьмутыя інтэр'еры, а перадуманыя, цікавыя, з нейкай ідэяй, дакладна як у „Пад залатой розаю — галіцкая жыдоўская кнайпа".

Сярод гонак за госцем, кліентам ці партфелем вырастаюць ці проста растуць з вякоў жывыя арганізмы львоўскіх камяніц. Счарнелыя сцены і старыя драўляныя вароты ў гэты раз жылі новым жыццём. Апрача ўнутранага жыцця і яго ўласнага рытму знешні выгляд дамоў ахарактарызавалі зялёныя травінкі. „Зялёныя святы", праваслаўная „Тройца" ў Львове мае вельмі традыцыйны выгляд. Не толькі храмы апранаюцца ў натуральную зелень прыроды, але зелянеюць вароты, зелянеюць стогадовыя балюстрады ў камяніцах, зелянеюць нават падлогі ў крамах. Зелянее табе галава. Прастудзіць яе найвыгадней на вуліцы Сербскай, дзе знаходзіцца невялічкая піўная крама. Піва там розных сусветных марак, але перш за ўсё поўны выбар найсмачнейшых украінскіх напояў. Пра ёмістасць тавару рашаеш сам, але з дэгустацыяй трэба быць уважлівым, бо, як папярэдзіў нас прыпадкам сустрэты польскі кінематаграфіст, цяжка выкруціцца ад штрафу. Яго аднак патрактавалі даволі па-сяброўску, дазволілі пачаставаць сябе кавай з суседняга шапіка. А ўсё гэта мела месца на самым папулярным месцы для прагулак, ля сходаў Львоўскага нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы і балету імя Саламеі Крушальніцкай. Эклектычны будынак здаецца быць адным з найбольш характэрных для Львова, таму дзікая колькасць турыстаў і мясцовых сутракаецца там пастаянна. Гэта быў святочны панядзелак, таму настрой гульні і адпачынку пазіраў з-за кожнага дрэва. Вакол фантана дзеці на міні-куадах. Зноў лавачкі наўкола дзяцей засялілі львавяне розных, асабліва старэйшых, пакаленняў. Бабулька з шарыкамі раз стоячы, іншым разам седзячы на краю іншай лавачкі чакае сваіх грывень. Іншая, больш аператыўная, прадае значкі: танныя і звычайныя ды канадскія, амерыканскія, калекцыянерскія і дарагія. Да выбару, але добрасумленная прадаўшчыца папярэджвае купляючых.

У шляхецкім касцюме на адной з лавак сядзіць шляхціц. Можа ён і ёсць ім, а можа толькі яму хацелася б ім быць, але выглядае аўтэнтычна і чакае сваіх традыцыйных, добравядомых суразмоўцаў. Пры свяце ці штодзень, насупраць яго і ў кожным іншым свабодным месцы чакаюць гульцы ў шахматы. На сто адсоткаў яны ўпэўненыя, што калі зараз няма канкурэнта, хутчэй за ўсё з'явіцца. Сядзяць у інтэлектуальным задуменні, амаль як помнікі, як працяг гарадской традыцыі. Тыя, якія шахматамі не цікавяцца, сабраліся ў канцы доўгага парку. Некаторыя нібыта выпадкова, іншыя з вялікай ангажаванасцю слухаюць свайго спікера. Гэта не парламентарны спікер, той хутчэй з'яўляецца фронтменам апазіцыі і з упэўненасцю прэзентуе свае рацыі. Усё гэта водгукі нядаўніх прэзідэнцкіх выбараў на Украіне. Але тут абмяркоўваюцца не толькі справы апошніх месяцаў: можна пачуць прозвішчы Краўчука і Кучмы. Доўгі святочны аналіз сітуацыі ў белых кашулях, касцюмах і з прычоскай. А тут дождж! Спакойна, няспешна ўсе ўдзельнікі дыскусіі ды ўсе слухачы пераходзяць пад найбольшае суседняе дрэва. У грамадзе размова працягваецца далей. Але гавораць не толькі сабраныя, але і сцены. Гаворыць, хаця гэтай мовы я можа ўжо не зразумела б, сярэднявечны армянскі касцёл, побач яго алтар з ліпавага дрэва. Чорны ад часу, пылу, дажджу, але стаіць непахісна, як Львоў цэлы.

Ілона КАРПЮК

Вачыма еўрапейца

Бо будуць канікулы

Назіральнікі, асабліва журналісты, разлічвалі на тое, што гэты працэс урэшце завершыцца 21 чэрвеня. На жаль, Акруговы суд у Беластоку зноўку яго адтэрміноваў. У гэты раз да 3 верасня. Гаворка пра працэс, які вядзецца перад беластоцкім Акруговым судом з заявы беластоцкага аддзела Інстытута нацыянальнай памяці (ІНП) у справе аб люстрацыйным абмане супраць падляшскага дэпутата клуба Лявіца Яўгена Чыквіна.

Здавалася, што сапраўды гэта ўжо будзе канец, тым больш, што шматразова так Яўген Чыквін, як і яго абаронца Кшыштаф Чашэйка-Сахайкі адзначалі: „Залежыць нам на як найхутчэйшым завяршэнні гэтага разбору".

Усё ж. Старшыня судзейскага складу пачала 21 чэрвеня са сцвярджэння, што абарона хацела паклікаць аўтараў аналізу аднаго з дакументаў пададзеных ІНП: „Заява дайшла запозна", — бездапаможна заявіла старшыня Беата Аліферук.

На гэта мецэнас Чашэйка-Сахацкі коратка і скрушна прызнаўся: „Прашу прабачэння"

Хвіліну здавалася, што заява будзе забраная абаронай, асабліва таму, што ў пэўны момант адвакат сказаў: „Гэта можа быць чарговае перацягванне справы". А дэпутату Чыквіну: „Можа гэта пакінем?"

Відаць было, што абвінавачаны вагаецца. Урэшце падтрымаў заяву на паклікане перад суд аўтараў аналізу, працаўнікоў бюро аддзела выяўлення і архівізацыі дакументаў ІНП у Беластоку. Суддзя стала гартаць свой каляндар. Аказалася, што неўзабавае ў яе канікулы, пасля — у іншай калегі судзейскага складу.

Прагучалі прапановы першых дзён верасня.

Пракурор Русіловіч:

— У мяне водпуск паміж 5 і 11 верасня.

Негацыяцыі працягваліся далей. Старшыня складу:

— Можа, паміж 1 і 3 верасня?

Канчаткова спыніліся на 3 верасня. Журналісты, выходзячы з залы, злосна шапталіся: „Ну так, справа скончыцца якраз перад самаўрадавымі выбарамі!"

Назіраю за гэтай справай ад пачатку, значыць, ад леташняй восені. Не раз пыталіся ў мяне знаёмыя, што я на гэты конт думаю, а асабліва ці думаю, што пан дэпутат Чыквін быў сакрэтным і свядомым супрацоўнікам Службы бяспекі.

— Не ведаю. Гэта ацэніць суд, — я адказваў заўжды, адчуваючы сябе пасля гэтых пытанняў як бок разгляду.

Я прыгадваю тое, што паўтараў Яўген Чыквін і што датычыць таксама шмат іншых людзей у час ПНР, выконваючых розныя пасады (Яўген Чыквін у перыяд, які ахоплівае цяперашні люстрацыйны разгляд, быў старшынёй Хрысціянскага грамадскага згуртавання ў Беластоку):

— Я быў прымушаны да нейкай формы кантактаў з функцыянерамі службаў.

Вядома, як разумею, пракурор ІНП перш за ўсё хоча даказаць, што Яўген Чыквін быў сакрэтным супрацоўнікам, значыць, што даносіў на калег, можа на іерархаў Царквы без іх ведама і на іх шкоду. Ці ІНП гэтага хоча ці не, гэтая справа мае без сумнення палітычны характар; калі б дэпутат Чыквін меў быць палічаны люстрацыйным абманшчыкам, гадамі не мог бы выконваць мандату парламентарыя, а з'яўляецца ён дэпутатам ад часу Кантрактнага Сейма з агромным выбарчым заплеччам у праваслаўных, беларускіх асяроддзях. Не бяруся, аднак, і было б гэта нязгодным з прынцыпамі журналісцкай працы, за ацэнку доказнага матэрыялу, выдавання прысуду за суд. Сцвярджаю, аднак, што працягванне гэтага разбору аж да верасня было непатрэбным. Фактычна, канчаткова вырашэнне суда можа (на жаль) упісацца ў асеннюю самаўрадавую кампанію.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Сямікаляровы рамонак з каляровага шкла — прыз VIII Фестывалю нацыянальных культур у Гродне. Вырабілі яго бярозаўскія шкловыдзімальшчыкі. 40 прызоў уручаны былі пераможцам конкурсаў фестывалю. У падрыхтоўцы вялікага свята ўдзельнічалі Міністэрства культуры, Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей, абласныя і гарадскія ўлады, Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур. Бюджэт фестывалю склаў каля 1 мільярда рублёў. Фестываль, які працягваўся тры дні — ад 4 да 6 чэрвеня — вылучаўся сваім размахам і быў вельмі відовішчным. Прыняло ў ім удзел каля 800 прадстаўнікоў 33 нацыянальнасцей, больш за тысячу гасцей з Беларусі, Польшчы, Расіі, Літвы, Украіны. Усе мы разам — таксама госці з Беласточчыны — маглі пазахапляцца яркім светам фестывалю з нацыянальнымі падворкамі, кухнямі, народнымі абрадамі і танцамі...

„Фестываль прызямліўся ў Гародні”

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Практычна немагчыма было абысці ўсе мерапрыемствы фестывалю ў горадзе велічыні нашага Беластока. Як сказала дэпутат Палаты прадстаўнікоў Марыя Бірукова, гэта яркая падзея ў жыцці Гродзеншчыны і ўсёй Беларусі: „Усебеларускі фестываль нацыянальных культур звяртае людзей да духоўных крыніц, сваіх каранёў, традыцый, якія трэба берагчы і развіваць. Ён накіраваны на тое, каб людзі ўсіх нацыянальнасцей, што жывуць у Беларусі, адчувалі сябе дастойна, сапраўднымі грамадзянамі нашай краіны, якія імкнуцца разам, плячо ў плячо тварыць, рабіць усё дзеля таго, каб мы, нашы дзеці і ўнукі жылі ў моцнай, квітнеючай дзяржаве. У Гродзенскай вобласці жывуць людзі 87 нацыянальнасцей. У нас ніколі не было канфліктаў на нацыянальнай, рэлігійнай глебе і, я глыбока пераканана, ніколі не будзе. Да ўдзелу ў гэтым свяце далучаюцца ўсё новыя нацыянальныя суполкі. На мінулым фестывалі іх было дзевятнаццаць, а цяпер у сям'ю ўдзельнікаў прыняты яшчэ чатыры нацыянальна-культурныя аб'яднанні, а таксама прадстаўнікі яшчэ дзвюх нацыянальнасцей, якія пакуль не стварылі сваіх аб'яднанняў”.

У той час актывісты „апальнага” Саюза палякаў арганізавалі канцэрт і выставу прац народных творцаў у дворыку будынка свайго офіса.

Свята нацыянальных культур пачалося тэатралізаваным шэсцем удзельнікаў фестывалю па горадзе. У гэтым годзе адкрыццё фестывалю ўпершыню адбылося на стадыёне цэнтральнага спартыўнага комплексу „Нёман”, які ўмяшчае больш за 10 тысяч гледачоў. Прагучаў канцэрт творчых калектываў нацыянальных аб'яднанняў Беларусі. Не забыліся і на ўшанаванне 65 гадавіны Перамогі: маладыя людзі, апранутыя ў форму салдат Чырвонай Арміі, ачолілі калону тэатралізаванага шэсця ўдзельнікаў фестывалю. Група прадстаўнікоў кожнага аб'яднання ўсклала вянкі да Вечнага агню. Перад моладзевай дыскатэкай прайшоў паўтарагадзінны канцэрт „Нашу Перамогу мы кавалі разам”. На стадыёне ўвечары выступіў Алег Газманаў. Паслухаць народнага артыста Расіі давялося толькі тым, хто атрымаў запрашальны білет на працы. Сярод навінак фестывалю — конкурс аматарскіх фільмаў, знятых нацыянальнымі аб'яднаннямі, конкурс маладых выканаўцаў нацыянальнай эстраднай песні, гала-канцэрт творчых дэлегацый нацыянальных суполак з усіх абласцей Беларусі, лазернае водна-феерычнае шоў на набярэжнай Нёмана. Вельмі шырокім быў „горад майстроў” народнай творчасці, многа культурных і спартыўных мерапрыемстваў арганізатары фестывалю падрыхтавалі для дзяцей. Самі назвы гавораць за сябе: „Душы народнай увасабленне” — работа горада народных майстроў Гродна. „Гасцей вітаем шчыра і сардэчна” — канцэрт творчых калектываў Гродзенскай вобласці. „Мы паклон вам і гучныя песні са сталіцы Радзімы прывезлі” — канцэрт Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хору імя Генадзя Цітовіча. „Беларусь, мы ўсе — твае дзеці!” — гала-канцэрт творчых дэлегацый нацыянальных суполак усіх абласцей Беларусі. „Мелодыі гадоў мінулых вяртаюць нас у маладосць” — дыскатэка 1980-х гадоў з удзелам групы „Парк Горкага” і зорак беларускай эстрады. „Смяяцца не грэх!” — гумарыстычная праграма з удзелам заслужанага артыста Расіі Аркадзія Арканава і тэатраў гумару Гродзеншчыны. „Вясёлкавая карусель” — свята дзіцячага нацыянальнага мастацтва. „У віхуры танца” — канцэрт ансамбля танца, музыкі і песні „Белыя Росы” Гродзенскай абласной філармоніі. „Талентаў шматкаляровы букет” — конкурс дзіцячай нацыянальнай эстраднай песні. „Нашу Перамогу мы кавалі разам” — канцэртная праграма, прысвечаная 65-годдзю Перамогі. „Мы — разам!” — маладзёжная танцавальна-забаўляльная праграма з удзелам груп „Бармен Шоў”, „Медатэк” і Радмілы Сямёнавай. Святочны феерверк — „Бацькаўшчына светлая мая”. Свята нацыянальнай паэзіі. „Народная творчасць — крыніца натхнення”. Работа горада майстроў Гродзенскай вобласці і горада Масквы. Інтэрфэст — работа інтэрнацыянальнай пляцоўкі. „Хай гукі музыкі чароўнай упрыгожаць слаўны фестываль” — свята духавой музыкі (духавыя аркестры горада Гродна і вобласці). Беларускі падворак. „Гульні народаў Беларусі” — свята гульні... 5 чэрвеня цэнтр Гродна пераўтворыцца ў вялікую інтэрнацыянальную пляцоўку. Адкрыты былі 27 нацыянальных падворкаў з нацыянальнымі абрадамі, рамёствамі, песнямі, танцамі, кухняй. Упершыню прадставілі сябе кітайцы і галандцы. Арганізатары плануюць падаць заяўку на ўступленне ў Міжнародную арганізацыю фестываляў. Аж зайздросна — пабраціму Беластока можа ўдацца такая маштабная імпрэза! Ды ў нас немагчымы такі фестываль нацыянальных культур... мінулай імперыі з *атаманамі* яе духа.

Сапраўды, цяжка было прыняць удзел ва ўсіх мерапрыемствах, да якіх горача запрашала Гродна. Пісьменнікі з Беласточчыны, сябры Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа”, галоўным чынам прымалі ўдзел у „Паэтычным трохкутніку” ў літаратурнай частцы „Бацькаўшчына светлая мая” — свяце нацыянальнай паэзіі. Адбыліся аўтарскія сустрэчы ў школах Гродна аўтараў з Беласточчыны, Гродна і Брэста. На сустрэчу ў абласной бібліятэцы імя Яўхіма Карскага прыбылі таксама аўтары з Расіі. Сярод аўтараў былі пісьменнікі ўсіх аўтарскіх суполак. „Ой, шкада, што Юрка Голуб не перайшоў у наш саюз!” — уздыхнуў адзін з пісьменнікаў з таго саюза, якога не з'яўляемся членамі. Гродзенскія аўтары амаль усе выступілі з моцна патрыятычнымі заклікамі, у неблагіх вершах. Толькі шкада вось таго, што беларускі, айчынны твар фестывалю відаць было, здаецца, толькі на стракатых плакатах, і то не ўсіх. А сціплая стойка-палічка з выданнямі пісьменнікаў Гарадзеншчыны стаяла пад рускамоўнай шыльдай на Савецкай плошчы. Відаць таму, што дзяржаве ў Гродне непатрэбная ні адна беларуская школа, ні адзін беларускі садок.

Пара збіраць лячэбныя зёлкі

Зараз найлепшая пара збіраць лячэбныя зёлкі. Сёлета яны параслі буйнымі. Праходзілі дажджы, не было засухі. Збіралі кветкі каштана, цяпер збіраюць язмінавыя, за якія на пунктах скупкі гайнаўскай суполкі з а.а. „Руно" плацяць па 20 зл. за кілаграм. За сухія пялёсткі валошкі плацяць 100 зл. за кілаграм, а за пялёсткі ружы — 30 зл. За кветкі ясноткі (глухой крапівы) можна атрымаць 100 зл. за кілаграм, маргарыткі — 20 зл., цярноўніка — 22 зл. і шыпшыны — 5 зл. за кілаграм. За кару каліны збіральнік атрымае 7 зл. за кілаграм, за кару крушыны — 2 зл. і вябры — 1,80 зл.

Можна збіраць і лісце лячэбных раслін. За ліст ягады чарніцы нам заплацяць 11 зл., мядзведжага часнаку, суніцы і мядункі — па 10 зл. Менш атрымаем за лісце падбелу (8 зл.), лясной парэчкі (7 зл.) і трыпутніка (5 зл.). Мала плацяць за сухое лісце маліны, ажыны, бярозы і крапівы — па 3,50 зл. за кілаграм. Няшмат можна зарабіць за зелле чабару і ясноткі — па 5 зл., браткаў — 4 зл., а ўжо за зелле малачаю ці хвашчу — па 3 зл. за кілаграм.

Лячэбыня зёлкі патрэбныя хворым. Я, калі прастуджуся і мне баліць галава, п'ю адвар з вярбовай кары. Памагае! Лякарства ў таблетках мне шкодзіць на страўнік. Адвар кары з вярбы ўспрымаецца як добрая гарбата. Вядома, не трэба рабіць адвару лішне горкім. Лепш менш тае кары. Можна крыху пасаладзіць.

Дзень інваліда ў Нараўцы

У Гмінным асяродку культуры ў Нараўцы 25 мая г.г. адбылася сустрэча людзей з няпоўнай спраўнасцю з нагоды Дня інваліда. Сабралася шмат людзей з усёй гміны. Мерапрыемства падрыхтавала Раённае праўленне Польскага саюза пенсіянераў і інвалідаў у Нараўцы, якому старшынствуе Ядвіга Карпюк.

З мастацкай праграмай выступілі вучні малодшых класаў Комплексу школ у Нараўцы. Зычылі яны пенсіянерам і інвалідам многа здароўя, радасці ды задавальнення з дзяцей і ўнукаў. Быў багаты пачастунак. Сустрэча праходзіла ў мілай і сардэчнай атмасферы. Адбыўся песенны конкурс з узнагародамі. Найпрыгажэй спявалі Анна Стульгіс, Яўгенія Вярбіцкая, Зіна Пацэвіч, Францішка Новак, Марыя Леўша, Юрка Равінскі і Ядвіга Карпюк. На акардэоне іграліі Мікалай Варанецкі і Марыя Леўша. Была таксама рэчавая латарэя, у якой не было пустых „лёсаў".

Старшыня Раённага праўлення ПСП Я. Карпюк паінфармавала пра чарговыя мерапрыемствы, м.інш. на 13 чэрвеня планаваўся пікнік „Прывітанне лета" ў Гушчэвіне ды 22 чэрвеня — экскурсія ў Гіжыцка.

Святкаванне Дня інваліда арганізавалі ў рамках праекта „Сеніёры добры спосаб маюць, нуду актыўна праганяюць", на які Раённае праўленне ПСП атрымала еўрасаюзныя фінансавыя сродкі.

Янка ЦЕЛУШЭЦКІ

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

У чаканні Беларусі

У дзень, калі Польшчу абышла інфармацыя, што прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка загадаў спыніць транзіт газу праз тэрыторыю Беларусі з Расіі, паміж першым і другім турам прэзідэнцкіх выбараў у Польшчы, на дарожным пагранпераходзе ў Кузніцы-Беластоцкай Браніслаў Камароўскі, маршалак Сейма, выконваючы абавязкі прэзідэнта і кандыдат ад Грамадзянскай платформы ў прэзідэнты падпісаў польска-беларускую дамову аб малым памежным руху (МПР). Аднак не так хутка яна будзе абавязваць. Беларускі бок не пачаў яшчэ працэдуры яе ратыфікацыі ў сваім парламенце.

Неаднаразова прадстаўнікі беларускіх улад адзначалі, што залежыць ім на хуткім уступленні ў сілу дамовы аб МПР. На тры гадзіны да таго як Браніслаў Камароўскі прыляцеў на верталёце ў Кузніцу (22 чэрвеня), Аляксей Зелянко, прэс-сакратар пасольства РБ у Варшаве тлумачыў „Ніве":

— Актуальна праект ратыфікацыйнай дамовы знаходзіцца на этапе ўнутрыдзяржаўнага абмеркавання. Пакуль трапіць у парламент, мусіць быць разгледжаны на ўзроўні міністэрстваў. Няма ў тым ніякіх праблем. Праект дамовы будзе абмеркаваны ў час асенняй сесіі. Патрэбны будуць яшчэ абмен ратыфікацыйнымі лістамі і подпіс пад дамовай нашага прэзідэнта. Беларусь хоча, каб дамова ўступіла ў сілу як найхутчэй.

— Значыць, калі беларускі бок завершыць усю працэдуру? — дапытваліся мы ў прэс-сакратара.

— Цяжка прадбачыць. Усё залежыць ад таго як хутка вырашыць парламент. Дамова мае разглядацца ў час асенняй сесіі, але пакуль яшчэ няма такога пункта ў парадку дня тае сесіі.

З нашых інфармацый вынікае, што беларускі бок чакае з ратыфікацыяй дамовы на МПР з увагі на эканамічныя вынікі мытнага саюза Расія-Казахстан-Беларусь (гэтая мытная прастора мае дзейнічаць з 1 ліпеня г.г.).

На ўрачыстасць падпісання дамовы аб МПР у Кузніцу прыехалі самаўрадаўцы з польскіх памежных гмін (у якіх пражывае галоўным чынам беларуская, але і літоўская меншасць, бо тыя гміны ахопіць таксама польска-беларуская дамова) ды прадстаўнік пасольства РП у Мінску. З'явіліся таксама дэпутаты ад ГП. Побач сябе сядзелі сканфліктаваныя паміж сабою былы старшыня падляшскіх структур Платформы Роберт Тышкевіч — старшыня парламенцкай групы па справах Беларусі і віцэ-старшыня камісіі замежных спраў, ды дэпутат Дам'ян Рачкоўскі, апошнім часам новаабраны шэф гэтай партыі на Падляшшы. Быў таксама дэпутат клуба Лявіцы Яўген Чыквін. Асабліва цёпла ваявода Мацей Жыўна прывітаў нядаўна абраную новую старшыню Саюза палякаў Беларусі Анжаліку Арэхву, якая замяніла на гэтай пасадзе адышоўшую па ўласнай просьбе Анжаліку Борыс.

Браніслаў Камароўскі сказаў перад падпісаннем дамовы:

— Я вельмі хацеў падпісаць гэтую дамову тут, на самай польска-беларускай мяжы, таму што лепей згэтуль відаць, якія новыя шанцы яна адкрые заадно так для польскай грамадскасці ў Беларусі, як і беларускай у Польшчы, так для палякаў, як і беларусаў, але і для ўсяго рэгіёна. Згэтуль таксама лепш відаць усё тое, што з'яўляецца адмоўным вынікам існавання цяжкай для перасякання мяжы ў штодзённых умовах, важных для кожнага жыхара гэтых зямель, для шмат якіх сем'яў. Тут яшчэ дзесьці існуе ўспамін тае славутае зоны, якая дзяліла свет і аддзяляла Польшчу ад суседзяў.

Выконваючы абавязкі прэзідэнта выказаў надзею, што на беларускім баку хутка завершыцца працэс ратыфікацыі дамовы аб МПР.

— Мне здаецца, што надалей можам разлічваць на тое, што ў кастрычніку або ў лістападзе, восенню, беларускі бок закончыць працэс ратыфікацыі, і дай Божа, каб на каталіцкія Каляды была ўжо шырокая свабода ў перасяканні гэтай мяжы, сустрэч сем'яў раздзеленых гісторыяй у рамках часам гэтых самых вёсак. Я хацеў бы, каб усе маглі разумна пакарыстацца ў Польшчы і ў Беларусі гэтай добрай дамовай. Жадаю таксама мясцовым самаўрадам, па абодвух баках мяжы, каб маглі яе выкарыстаць для пабудовы атмасферы даверу і ветлівасці ды прасоўвання польска-беларускіх спраў дапераду. Жадаю таксама польскай і беларускай краінам, каб гэтая дамова была важным крокам у напрамку ўзмацнення супрацоўніцтва, у карысць усіх палякаў пражываючых у Беларусі і беларусаў у Польшчы. З радасцю стаўлю гэты подпіс, таму што гэта будзе таксама і ў маю карысць.

З нагоды падпісання дамовы падляшскі ваявода Мацей Жыўна падараваў Браніславу Камароўскаму драўляную мініяцюрку зубра — сімвал падляшскага рэгіёна.

— Спадар ваявода, баюся, што гэта будзе выглядаць па-выбарчаму, бо чуў, што дзесьці мяне асацыявалі з зубром! — жартаваў в.а. прэзідэнта.

— Ды зубр гэта сіла, — адзначыў ваявода.

Прамовілі таксама прадстаўнікі самаўрадаў. Бурмістр Крынак Іаланта Гудалеўская:

— Спалучаем з гэтай дамовай вялікія надзеі, перш за ўсё таму, што на тамашнім баку жывуць нашы сваякі, сябры і знаёмыя. Маем таксама надзею, што ў сувязі з гэтай дамовай ажывіцца гаспадарка, мабыць, спачатку ў галіне гандлю, ды важнае і гэта. Спадзяюся, што яшчэ больш узмоцніцца супрацоўніцтва паміж самаўрадамі, у сферы культуры, асветы і ў іншых грамадскіх галінах.

Войт Белавежскай гміны Вальдэмар Літвіновіч:

— Я хачу падзякаваць за падпісанне дамовы таксама ад імя беларускага боку. Маю на гэта права, бо і ў мяне там сям'я, і дзякуючы гэтаму пагадненню маю надзею, што нашы кантакты зноў ажывяцца, таму што шмат гадоў былі ў іх цяжкасці, а нават часам былі яны немагчымыя.

І дадаў жартам:

— Белавежская пушча і цяпер таксама раздзеленая і нашы зубры не могуць сустракацца з беларускімі зубрамі, а з гэтых сустрэч магло б атрымацца шмат добрага.

Браніслаў Камароўскі:

— Дзякую вам за прыгаданне гэтых зуброва-зубровых сувязей, хоць думаю, што тут гаворка пра зуброў і зубрых. Белавежская пушча таксама павінна быць аб'ядноўваючым элементам. Думаю, што ў будучыні польска-беларуская мяжа будзе лёгкай для перасякання для ўсіх.

Голас узяла таксама Анжаліка Арэхва:

— Для палякаў, пражываючых у Беларусі, гэта гістарычная хвіліна. Цешымся, што ў гэтай зоне апынулася Гродна. Лічым на тое, што на беларускім баку гэтая дамова хутка будзе ратыфікаванай.

В.а. прэзідэнта пры нагодзе падпісання дамовы аб МПР агледзеў пагранпераход у Кузніцы. Зацікавіўся м.інш. складам канфіскаваных кантрабандных цыгарэт, теленазіральным пунктам і спрабаваў пасябраваць з бельгійскай аўчаркай Ігай, спецыялісткай па выкрыванні цыгарэтнай кантрабанды.

— І я мог бы здасца, таму што не куру, — пагладзіўшы сабаку, пракаментаваў Браніслаў Камароўскі.

На жаль, у в.а. прэзідента не было часу, каб у Кузніцы паразмаўляць з журналістамі. Аднак на пытанне „Нівы" (і пасля Радыё Беласток) адказаў. Спыталіся мы ў яго, ці быў бы схільны пасадзейнічаць, як магчымы будучы прэзідэнт, у тым, каб зона МПР ахапіла не 30, а 50 км і гэтым самым м.інш. Беласток. З такой заявай выступаюць самаўрады, м.інш. на сустрэчы ў Кузніцы ўспомнілі аб тым бурмістр Крынак і войт Белавежы. Браніслаў Камароўскі адказаў:

— Мусім пакуль цешыцца, што будзе пояс МПР у 30 км. Гэта добра, што ў гэтай справе ўзрастаюць апетыты, бо мы ўсе хацелі б, каб абмежаваць функцыянаванне дзяржаўнай мяжы як бар'ера. Я прапанаваў бы ўсім быць радымі таму, што на польскім баку ўступіла ў сілу вырашэнне звязанае з МПР. Прапаную таксама разлічваць на тое, што на беларускім баку стане гэта да канца года і тады плануйма пашырэнне.

— Значыць, вы не выключаеце такой магчымасці? — дапытваліся мы.

— Не выключаю. Прашу аднак памятаць, што гэтая дамова, якая ацанялася Еўрапейскай камісіяй, змяшчае дэталёвыя вырашэнні ў абсягу шэнгенскага дагавора і змены ў іх не такія простыя і відавочныя.

Прыгадаем: Польшча выступіла з ініцыятывай заключэння дамовы аб малым памежным руху ў лютым 2008 г., на што давалі магчымасць правілы распараджэння Рады Еўропы і Еўрапарламента ад снежня 2006 г. Міністры замежных спраў Польшчы Радаслаў Сікорскі і Беларусі Сяргей Мартынаў падпісалі дамову ў лютым 2010 г. 21 мая польскі Сейм аднагалосна яе ратыфікаваў.

Праўда і міфы пра вайну

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

(працяг з 26 н-ра)

Вялікую ролю ў прышчапленні гэтай нацыянальнай беларускай свядомасці адыграў нямецкі генеральны камісар Беларусі Вільгельм Кубэ. У ягоны час школьніцтва было выключна беларускае, паўнацэнная была беларуская сімволіка. Гэта дало нечаканыя і незразумелыя нават самім немцам вынікі. У нямецкую акупацыю нацыянальная свядомасць беларускай моладзі моцна ўзрасла.

Гэтую з'яву ўскосна пацвярджае кніга Наталлі Гардзіенкі, прысвечаная беларусам у Вялікабрытаніі, якіх шмат апынулася там у пасляваенны перыяд. Прыбылі яны туды з арміі генерала Андэрса, у якую яны трапілі са сталінскіх лагераў, падаючыся палякамі: было іх некалькі тысяч. І з гэтых тысяч пасля вайны толькі каля трыццаці ўключылася ў беларускі нацыянальны рух. Затое намнога большая нацыянальная свядомасць была ў тых, якія прайшлі нямецкую акупацыю — і гэта яны трымалі беларускую эміграцыю, выяўляючы вынік нацыянальнай палітыкі Кубэ. Гэтая праўда вельмі нявыгадная ўладам савецкай і постсавецкай Беларусі. І калі палітычную „праўду" нельга пагадзіць з праўдай дакументаў, тады ўзнікаюць міфы.

Вось у маіх родных Дукштах [цяпер Dukštas на тэрыторыі Літвы недалёка сутыкнення граніц Беларусі, Літвы і Латвіі — А. В.] зараз пасля прыезду савецкіх танкаў у 1944 годзе адзін савецкі афіцэр узлез на бочку і стаў нам гаварыць пра жудасці пад нямецкай акупацыяй. А я ж пад той акупацыяй вучыўся, жыў у інтэрнаце, дзе давалі харчаванне. З жудасцей бачыў адно вываз жыдоўскага насельніцтва; і толькі.

А было так, што з пачаткам вайны 22 чэрвеня 1941 года я падаўся да калегі, што жыў мо кіламетр ад мяне, аддаць пазычаную ў яго кніжку. Іду і бачу самалёт з чорным крыжам налятае. Я спужаўся і ў роў схаваўся; праляцеў той самалёт і стала ціха. З пагорка пабачыў я доўгія штукі палатна на полі, а хлопцы бяруць зброю ад немцаў, над мястэчкам лунаў літоўскі сцяг. Літоўцы маланкава стварылі сваю адміністрацыю і самаахову, якая не дапусціла на тую тэрыторыю савецкай партызанкі. Працавала пошта, жыццё адбывалася нармальна; у Беларусі было інакш.

У 1939 годзе Дукшты апынуліся ў складзе літоўскай дзяржавы. І пайшла бурная літуанізацыя. Мая маці, якая не ведала літоўскай мовы, страціла працу. У школе зараз 70-80% маіх сяброў перасталі разумець па-польску! А я зусім не ўмеў па-літоўску, плачу... Але праз тры месяцы навучыўся; і то так, што на канец навучальнага года атрымаў па літоўскай мове чацвёрку, больш, чым мае карэнна літоўскія калегі.

Прадказанне савецкага афіцэра, што быў узлез на бочку, пачало збывацца. Мясцовая жыхарка Марына Мельнікайтэ — стараверка Марыя Мельнікава — была ўцякла з саветамі ў чэрвені 1941 года, а пасля вярнулася з савецкім дэсантам у якасці дыверсанткі. Аднак яе злавілі мясцовыя людзі, з гранатай, якая не спрацавала. І забілі на могілках. Пасля саветы стварылі міф, што ў Дукштах была ўзведзена шыбеніца, пад якую сагналі мясцовае насельніцтва глядзець здзекі акупантаў над тою народнай мсціцелькай...

Славамір Іванюк і Юры Туронак

У акупацыйны перыяд саветы жорстка праследавалі парасткі беларускай нацыянальнай свядомасці, гэтага не жадала кампартыя. Савецкія партызаны забівалі настаўнікаў, што працавалі ў карысць беларускасці. Інакш было ў Беластоцкай акрузе, якая не была падпарадкавана нямецкай цывільнай адміністрацыі Беларусі; тут савецкія партызаны не чапалі беларускага школьніцтва, а нават падтрымлівалі спадзяючыся падтрымкі насельніцтва.

Беластоцкую акругу немцы думалі далучыць да Усходняй Прусіі, але толькі пасля заканчэння вайны. У вайну да Усходняй Прусіі былі далучаны Сувалкі, таму, што яны былі захоплены як тэрыторыя неіснуючай ужо польскай дзяржавы, а Беласток быў жа ў складзе ўсё існуючага Савецкага Саюза, таму яны лічылі, што яго вось так сабе нельга далучыць: Ordnung muss sein!

Чаму немцы дазвалялі на рост нацыянальнай свядомасці беларусаў? Гэта была ініцыятыва Кубэ, бо СС і паліцыя мелі іншыя мэты. Берлін яшчэ не вырашыў, што мае быць з тэрыторыяй Беларусі. Прыбалтыка мела стаць асобнай правінцыяй Рэйха, а адносна Беларусі планаў, нават у 1943 годзе, не было; Гітлер адтэрміноўваў рашэнне нацыянальнага пытання, хаця прымаліся ў гэтым плане меры па ўтаймаванню некаторых нацыянальных памкненняў, напрыклад, берлінскія ўлады загадвалі душыць бандэраўскі рух.

Мікола Ваўранюк прыгадаў, што бацька спадара Юрыя Туронка сядзеў разам з дзедам Зянона Пазьняка ў санацыйнай турме за беларускамоўную каталіцкую „Крыніцу"...

У майго дзеда, па бацьку, было шмат дзяцей, але не было зямлі і ён яе арандаваў у памешчыкаў. У 1921 годзе адбыўся перапіс насельніцтва Віленскага ваяводства. У фальварку, дзе жыў дзед, на адзінаццаць душ дзесяць складалі Туронкі. І ўсе яны запісаліся каталікамі і беларусамі; мой дзед быў абсалютна свядомым беларусам. Мой бацька пачынаў гімназічную вучобу ў Вільні, а завяршыў у Яраслаўлі, у бежанстве. У 1917 годзе вярнуўся на радзіму, дзе стаў арганізаваць беларускае школьніцтва. Чатыры гады працаваў ён настаўнікам, а пасля, у Вільні, стаў ствараць Беларускі студэнцкі саюз. І вельмі злаваўся, калі мы не гаварылі па-беларуску, таму мы і не гаварылі інакш.

Як я апынуўся ў Польшчы? Мая маці была родам з Рушчан, што пад Харошчай. Вучылася ў Вільні і там пазнаёмілася з бацькам. Бацька ў 1938 годзе памёр, у вайну згарэў наш дом і маці рашыла вярнуцца да братоў у Рушчаны, а і ейныя сёстры жылі ў недалёкіх Трыпуцях. Тут нам было цяжка, бо хаткі ў радні былі малыя, і дзяцей было шмат. Я асабіста не рваўся ў Польшчу, мне было добра ў Літве.

У Беластоку стаў вучыцца ў школе, што зараз на рагу Варшаўскай і Касцельнай; дырэктар мяне прыняў вельмі ветліва. Але на ўроку гісторыі прафесар стаў мяне распытваць пра Грунвальдскую бітву. Я пра яе добра ведаў, стаў расказваць так, як мяне навучылі ў літоўскай школе. Стала ціха ў класе, а пасля вучні сталі смяяцца. „Siadaj, nic nie umiesz!" — сказаў прафесар і двойку мне ўляпіў. Тады я і асэнсаваў пытанне палітычнай праўды. На канец навучальнага года атрымаў я тры двойкі, у тым ліку і па гісторыі. Пакінуў я Беласток і перанёсся ў Ольштын.

Ваньковіч быў напісаў, што адны палякі штурмавалі Монтэ-Касіна, а іншыя яго баранілі. І калі я ў Беластоку іду вуліцай Герояў Монтэ-Касіна, не ведаю, якім яна героям...

І ніхто з нас не дасягае абсалютнай праўды. Мы робім памылкі, пасля выпраўляем іх на аснове дакументаў. І я б хацеў, каб маладыя людзі прадаўжалі даследаванні ўзнятай мною тэмы, — сказаў у завяршэнне спадар Юры Туронак.

Памянулі Міхала Валовіча

Споўніліся 204 гады з дня нараджэння беларускага нацыянальнага героя Міхала Валовіча, які па загадзе гродзенскага губернатара расійскага генерал-маёра Мураўёва быў схоплены і павешаны 2 жніўня 1833 года ў Гродне каля Скідальскай заставы.

У суботу, 19 жніўня, слонімцы, а таксама прадстаўнікі творчай і палітычнай эліты Мінска, Гродна, Беластока наведала вёску Парэчча Слонімскага раёна, дзе каля вясковых могілак знаходзіцца мемарыяльны знак, прысвечаны Міхалу Валовічу і яго паплечнікам, якія загінулі за незалежную Беларусь у барацьбе з Расійскай імперыяй.

Сустрэчу адкрыў кіраўнік слонімскай незарэгістраванай арганізацыі Беларускай хрысціянскай дэмакратыі Іван Бятко. Гісторык і ўраджэнец вёскі Парэчча Аляксандр Талерчык згадаў пра Міхала Валовіча і яго сяброў. У прыватнасці ён расказаў пра пачатак паўстання на Беларусі, спыніўся на біяграфічных звестках пра Міхала Валовіча.

Нагадаем, што Міхал Валовіч нарадзіўся ў маёнтку Парэчча на Слонімшчыне ў сям'і слонімскага падкаморнага са старадаўняга беларускага шляхецкага роду Валовічаў. Скончыў Віленскі ўніверсітэт, быў блізкі да тайных таварыстваў філаматаў і філарэтаў.

Наш зямляк прымаў удзел у паўстанні 1830-1831 гадоў. Пасля разгрому паўстання эміграваў у Францыю. Праз два гады зноў вярнуўся на Беларусь з мэтай узняць паўстанне супраць рускага царызму і абвясціць Беларусь дэмакратычнай рэспублікай.

У 1833 годзе ён арганізаваў на Слонімшчыне паўстанцкі атрад з некалькіх дзесяткаў чалавек. Супраць яго Мураўёў-Вешальнік кінуў 10 тысяч расійскіх салдат. У траўні атрад Валовіча быў разбіты, а кіраўнік арыштаваны. Яго прывезлі ў Гродна і першы допыт вёў сам Мураўёў, які чакаў ад Валовіча сенсацыйных звестак пра свой атрад. Але гэтага не адбылося. Змагар за нашу Бацькаўшчыну быў пакараны.

Праз трыццаць гадоў тым жа Мураўёвым і ў такім жа 26-гадовым узросце, але не ў Гродне, а ў Вільні быў павешаны Кастусь Каліноўскі, прадаўжальнік справы Валовіча і кіраўнік нацыянальна-вызвольнага руху беларускага народа супраць расійскага зняволення.

Як сказаў гісторык Аляксандр Талерчык, на радзіме Міхала Валовіча ў вёсцы Парэчча, побач з царквою, быў некалі пастаўлены яму прыгожы белы мармуровы помнік, а помнік яго паплечнікам — у вёсцы Шундры. На вялікі жаль, у 1940 годзе бальшавікі ўсё гэта знішчылі.

Пра Міхала Валовіча ў Парэччы згадвалі палітыкі з Мінска і Гродна Лявон Баршчэўскі, Аляксей Янукевіч, Віталь Рымашэўскі.

Прысутныя ўсклалі кветкі і вянок да помніка героям, праспявалі гімн „Магутны Божа". Верыцца, што наступіць час і з'явіцца помнікі Міхалу Валовічу і ў Парэччы, і ў Слоніме, і ў Гродне, а яго імем будуць названы вуліцы і плошчы нашай рэспублікі.

Сяргей ЧЫГРЫН

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Як запрагаць каня?

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

У якім узросце маладыя хлопцы пачыналі працаваць у полі з канём? — гэтага магла даведацца мужчынская часць XXIV Сустрэч „Зоркі". Маладых рэдактараў наведалі Сяргей Целушэцкі з Новага Ляўкова і Эрык. А хто гэта Эрык? — гэта дваццацігадовы конь спадара Целушэцкага. Наш госць крок за крокам паказаў ды растлумачыў як запрагаць і распрагаць каня. Даведаліся мы як называюцца прылады, якіх ужываецца, калі конь цягне воз.

— Гэта *гнойніца*, гэта *падагонік*, а гэта *аглоблі*, — паказваў нам спадар Целушэцкі. Аказваецца, што запрэгчы каня не так зноў і лёгка. Наш госць навучыўся ад свайго старэйшага брата, у чатырнаццаць гадоў. Як растлумачыў Сяргей Целушэцкі, калісь ужо маладыя хлопцы мусілі цяжка працаваць з канём: баранавалі, аралі, выворвалі бульбу, прыворвалі пад збожжа. Апрача гэтага вадзілі коней на пашу.

— Эрык гэта вельмі спакойны конь, — сказаў наш госць. — Мае ўжо свае гады! Яго назвалі мае ўнукі. Але праца з канём не заўсёды бяспечная. Здараецца, што конь спалохаецца і бяжыць вельмі хутка. Тады немагчыма яго затрымаць. Можна нават зляцець з воза! Якраз гэтае здарылася дзядзьку Сяргею, аднак — ніколі з Эрыкам!

Сустрэча з гаспадаром Целушэцкім і курсы запрагання каня закончыліся катаннем на возе.

„Пружына", аўтары: ***Лукаш Філіпюк****, IV клас ПШ № 3 у Бельску- Падляшскім,* ***Грышка Зінкевіч****, IV клас ПШ № 3 у Бельску-Падляшскім,* ***Якуб Ваўрусевіч****, IV клас ПШ № 3 у Бельску Падляшскім,* ***Пятро Аўксенцюк****, I клас Бегімназіі ў Гайнаўцы.*

Беларус і вялікі свет

Фота Лукаша ЗІНЕВІЧА

Дзякуючы Сустрэчам „Зоркі" маем магчымасць сустрэць людзей міжнароднай вядомасці. У папярэдніх гадах мы размаўлялі з радыёжурналістам Тамашом Саевічам, які працуе карэспандэнтам у Кітаі, а раней у Іраку. Год таму мы сустрэліся з паэтам і мастаком Камілем Сіповічам і тэатральным рэжысёрам Пятром Бароўскім. У гэты раз мы сустрэліся з фатографам Андрэем Лянкевічам. Хаця ён яшчэ маладога ўзросту, яго здымкі вядомыя ўжо ў Заходняй Еўропе і ЗША. Пачынаў як зусім звычайны чалавек; нарадзіўся ў Гродне, вышэйшую адукацыю закончыў у Мінску. Паводле Андрэя, фатограф павінен паказваць гледачам сур'ёзны свет, а не прыдуманыя вобразы, якія не існуюць. Вынікам ягонай працы з'яўляюцца паасобныя цыклы здымкаў з розных куткоў свету, між іншым з далёкай Арменіі. Каб добра зразумець тамашніх людзей, фатограф нейкі час жыў разам з імі. Спалі яны ў адным намёце, елі адзін хлеб. Таму, што Андрэй вытрымаў у цяжкіх умовах, яго здымкі вельмі вартасныя для гледачоў. Яны паказваюць нам суровы свет, які кіруецца сваімі правамі і меркамі. Людзі там залежныя ад сябе, яны даглядаюць аднаго статка жывіны, разам выпякаюць хлеб, выконваюць свае рытуалы. Сціплыя ўмовы жыцця не перашкаджаюць ім быць шчаслівымі.

Апрача таго мы мелі магчымасць пабачыць публікацыі фатографа ў вядомых газетах: „GEO", „Le Figaro", „New York Times", „Gazeta Wyborcza". Гэта паказвае, што калі чалавек мае талент і яго развівае, можа стаць вядомым на ўвесь свет, нават калі ён з Гродна.

Наталля КАНДРАЦЮК-СВЯРУБСКАЯ
„Цікаўнасць", II клас III Агульнаадукацыйнага ліцэя ў Беластоку

Фота Міры ЛУКШЫ

Марыла стаць мастачкай!

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Вялікай неспадзяванкай для нас была сустрэча з Яўгеніяй Казлоўскай з Новага Ляўкова. У час размовы мы многа даведаліся аб колішнім жыцці людзей, іх праблемах і радасцях. Самым цікавым было тое як бабуля патрапіла ўцягнуць нас у адпаведны настрой. Найбольш нас цікавілі гісторыі з яе дзяцінства і пазнейшага жыцця. Мы даведаліся, што адной з яе мараў было стаць мастачкай. Мастацкія здольнасці дзяўчынкі прыкмеціў Ян Мароз, папулярны мастак з Семяноўкі. Калі ён пабачыў яе малюнкі, заахвоціў яе вучыцца мастацтву. На жаль, развіваць мастацкія здольнасці ў пасляваенны час не было магчымасцей. У вайну згарэлі ўсе будынкі, людзі ледзь зводзілі канцы з канцамі. Ад наймалодшых гадоў дзеці дапамагалі бацькам у гаспадарцы:

— Калі б я нарадзілася яшчэ раз, я напэўна малявала б, — кажа бабуля.

Яўгенія Казлоўская нарадзілася ў 1937 годзе. Дваццаць гадоў пазней у беларускай вёсцы Валілы прыйшоў на свет сучасны суветнавядомы мастак Лявон Тарасэвіч. Нямнога часу мінула, але многа змянілася.

Уля БЕРАЗАВЕЦ
„Цікаўнасць", I клас гімназіі ў Нарве

Фота Міхаліны ГЕРАСІМЮК

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Мажэна і Людміла Казлоўскія

У сям'і сіла!

Бора-Здруй гэта агратурыстычнае гаспадарства, а Людміла і Барыс Казлоўскія — яго ўласнікі. Яны пабудавалі тут пансіянат, адукацыйную сцежку *Лясная галерэя*, побач якой стаіць млын. Ва ўрочышчы таксама знаходзіцца пляц гульняў, а за пансіянатам стаіць гумно, у якім зроблена хата на ўзор даўніх (месца называецца *Вёска ўчора*). Але ці толькі Людміла і Барыс гэтым займаюцца? Аказваецца, што не. У іх тры дачкі. Мне ўдалося спаткацца з дзвюма: Аняй і Мажэнай. Калі я ўвайшла ў хату спадарства Казлоўскіх, ужо ад парога пачула пах сямейнага цяпла. На падлозе ляжалі трускалкі, а калі я перайшла далей, пабачыла як пані Мажэна малюе ногці. Яна крыкнула да сястры: *Аня, хадзі!* Яны прынялі мяне вельмі ветліва. Я раней чула, што Аня хоча займацца коньмі, аднак калі я пачала з імі гутарку, даведалася, што такія планы існавалі ў мінулым.

— Турысты не цікавяцца коньмі. Мы іх прадалі, бо было з іх замала прыбытку, а замнога працы, — кажа спадарыня Мажэна.

— Я закончыла сельскагаспадарчы тэхнікум у Супраслі і магу гадаваць коней, — дадае яе сястра Аня.

Калі мы гутарылі пра агратурызм, мяне вельмі цікавіла ці іх бабуля Жэня расказвала ўнукам казкі. Яны сказалі што так. І гэта былі не толькі фантастычныя расказы, а таксама народныя паданні. Яны слухалі сваю бабулю, калі разам капалі бульбу. У сакрэце сказалі: *Мы надалей слухаем бабулю!* Яна расказвае пра даўнія часы. Калі я вярнулася да тэмы турызму, на іх тварах паявілася ўсмешка. Я пахваліла ежу, якую варыць спадарыня Людміла і спыталася ці ў будучыні яны плануюць адкрыць карчму. Сёстры згодна адказалі: *Не!*

— Бацька цяпер будуе вялікую залу. У ёй будуць адбывацца вяселлі, хрысціны і падобныя імпрэзы, — кажа пані Мажэна.

Я прыгадала ім таксама сустрэчу з Міхасём Андрасюком. Ён гаварыў, што не марыць аб паездцы ў Егіпет, лепш яму апынуцца ў пушчы. Адказалі, перш-наперш трэба параўнаць, але калі мова пра кароткія паездкі, пушча ім больш падабаецца.

— Калі мы вучыліся ў Беластоку, вельмі сумавалі за хатай. Мы больш прызвычаены да жыцця ў вёсцы, — гаворыць пані Аня.

Спадарыня Аня цяжарная. У гэтым выпадку мне трэба было спытацца ці дзіця будзе выхаванае ў „духу пушчы". Жанчыны адказалі, што дзіця напэўна палюбіць лес, выхаваюць яго на прыродзе, будзе здаравейшае.

— Думаю, што будзе вясковае, — кажа з усмешкай пані Аня.

Калі гаворка пра дзяцей, то я і мая рэдакцыйная сяброўка паехалі ў Ляўкова, каб даведацца ад дзяцей, у што яны любяць гуляць. На жаль, дзяцей мы не сустрэлі. Я падумала, што спытаю пра іх у гаспадароў.

— Яны ходзяць у святліцу, лепяць з гліны, паўстаюць рок-гурты. Існуе таксама фальклорны ансамбль „Цаглінкі". Летам ходзяць на раку, — сказалі нам жанчыны.

Калі мы гутарылі пра дзяцей, пані Мажэна ўсміхнулася. Я хацела, каб яна мне расказала пра свае зацікаўленні педагогікай. Аказваецца, у пані Мажэны добры падыход да дзяцей і адпаведная адукацыя.

— Калі б у нас не атрымалася з агратурызмам, я пайду працаваць у школу, — кажа.

Пагутарыла я яшчэ са спадарыняй Людмілай і бабуляй Яўгеніяй. Яны сказалі з задавальненнем:

— Калі дзяўчаты хочуць астацца, то мы таксама хочам займацца агратурызмам.

На канец бабуля Жэня паказала мне банкетную залу. Я была ўражаная яе вялікімі памерамі. Пасля гэтай сустрэчы смела магу сказаць: *Казлоўскія сапраўдныя гаспадары, а іх сіла ў дружнай сям'і!*

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Дар'я ВАПА,
***«Пружына»*,**
VI клас ПШ № 4 у Беластоку

Музыка з кайфам

„Індра" вакол

Сучасны мастацкі Полацк асацыюецца мне ў першую чаргу з мастацкім словам. Як першага яго ўладальніка прывяду Уладзіміра Арлова, якога абсалютна цудоўна пазнаем на ўласным сайце ўжо ў першых словах: „Уладзімір Арлоў нарадзіўся ў найстаражытнейшым беларускім горадзе Полацку ў год Зьмяі паводле ўсходняга календара і ў год сьмерці Сталіна паводле календара савецкага". Другая асоба, якая вельмі паважае імкненне да майстэрства слова, гэта паэтка, бардэса, настаўніца, дзячка Лера Сом. Хаця сын Уладзіміра Арлова, Раман, выступаў у гурце „J:mors", а зараз заснаваў уласны („Ў нескладовае"), то сёння найбольш нас будуць цікавіць сувязі з музыкай паэткі Сом. Аказваецца, што карыстаецца яна павагай не толькі сяброў і калег-дзеячаў, але таксама маладых музыкаў, асабліва ў Полацку. Дзякуючы яе тэкставай дапамозе, упэўнена праз беларускія сцэны крочыць гурт „Індра". Тут спатыкаюцца і дапаўняюцца два пакаленні. Цікавяць іх падобныя тэмы, ставяцца да жыцця ў падобны спосаб, а ў выніку атрымліваецца творчасць гурту „Індра".

„Індру" заснавалі ў асноўным дзяўчаты — гітарыстка і вакалістка, да якіх імгненна далучылася віяланчэлістка, а пасля і хлопцы — бубнач ды чарговыя бас-гітарысты. Ідэю працягваюць з 2003 года, хаця, як гавораць легенды, думка пра стварэнне гурту круцілася па галаве гітарысткі Марыны Шэф яшчэ і два гады раней. Рытмічны поп-рок, прагрэсіўны, як дадаюць самі музыкі, гэта музыка характэрная толькі і выключна гэтаму гурту, немагчыма пераблытаць іх з іншымі. Дапамагае яшчэ і вакал Вольгі Андрэевай, моцны і не менш характэрны. А калі гаварыць пра назву, то дапамагла кніжка пад загалоўкам „Бэн Гур". Сябры новаствораннага гурту цягнулі лёсы з назвамі і імёнамі, крыніцай якіх стала згаданая кніжка. І так індыйская міфалогія аказалася знакавай для полацкага гурту. Дэбютны альбом „Сонцавакол" выйшаў у 2007 годзе, хаця спробы запісу вяліся раней, але, як аказалася, якасці запісу сябры гурту не адобрылі.

А сёння? Усе добра ставяцца да сваёй працы, тым больш, што „Індра" зараз даволі добра ўспрымаецца ў Беларусі, па пляцоўках і клубах. Галоўнае, што сябруюць і гэта таямніца іх рашучасці ды ўсіх поспехаў.

http://indra2003.com

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 27

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 22:

Кіт, ратунак, дамова, баран, парк, Ала, хор, абсяг, мара, нага, тэрмас. Сад, покат, табар, рэ, гумар, дар, норка, кава, іканастас, ля, вінаград.

Узнагароды, запісныя кніжкі, выйгралі **Вія-лета Рушук, Войцех Лаўрыновіч** з Новага Корніна, **Рафал Вакулюк** з Арэшкава. Віншуем!



Поспехі і паразы ў самаўрадавай дзейнасці

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

(пачатак у № 25)

У апошніх гадах заўважаецца вялікі зрух у гмінных інвестыцыях, калі гмінныя сродкі на перабудову інфраструктуры сталі моцна падмацоўвацца грашыма з еўрасаюзнага бюджэту. Таму апошнім часам у нашых гарадах і вёсках мадэрнізаваліся і перабудоўваліся многія дарогі, пракладаліся водаправоды і зараз па сёлах з вялікім махам пракладаецца каналізацыя. Аднак у выпадку гэтых інвестыцый можна дагадзіць толькі невялікай частцы насельніцтва, бо калі, напрыклад, у гміне за чатырохгадовы перыяд паўнамоцтваў рады будавалася некалькі адрэзкаў асфальтавых дарог, то ў іншых месцах, а асабліва там, дзе людзі доўга чакалі рамонту сваіх дарог і не дачакаліся, выклікала гэта незадавальненне. Калі рэалізавалася агульнагмінная інвестыцыя, тады не магло быць закідаў, што маючы на ўвазе геаграфію горада, нейкія жыхары былі вылучаны ў параўнанні да іншых. Аднак у выпадку такіх праектаў як, напрыклад, будова крытых басейнаў у Бельску і Гайнаўцы, узнікала рознагалоссе ці ўвогуле патрэбны шыкарныя басейны за вялікія сродкі. Зараз самая вялікая або адна з самых вялікіх гмінных інвестыцый, рэалізаваных на Гайнаўшчыне і Бельшчыне, гэта будова ў Гайнаўцы побач вуліцы Парыева Прадпрыемства па перапрацоўцы адкідаў, на якое гарадскія ўлады атрымалі вялікае дафінансаванне з еўрасаюзнага бюджэту. Мяркуецца, што пратэсты часткі жыхароў Гайнаўкі, што жывуць побач участкаў, дзе будуць складвацца перасартаваныя адкіды, паводле спецыялістаў няшкодныя для асароддзя (будуць будавацца вялікія сіласы на гайнаўскіх лугах у напрамку вёскі Хітрая), не спыняць комплексу рэалізаваных інвестыцый. Прадбачваецца таксама, што адзіночныя пратэсты жыхароў вуліцы Дольнай і яе наваколля не стрымаюць таксама будовы заліву побач вуліцы Паддольнай у Гайнаўцы.

Шыкарны павільён з сартавальняй адкідаў Прадпрыемства па перапрацоўцы адкідаў у Гайнаўцы (непадалёк ад вуліцы Парыева) — гэта самая вялікая або адна з самых вялікіх гмінных інвестыцый на Гайнаўшчыне і Бельшчыне

Стараліся прыцягнуць вонкавы капітал

Адной з важнейшых задач самаўрадаў было таксама прыцягненне інвестараў, якія давалі б мясцоваму насельніцтву новыя месцы працы, а гмінныя бюджэты папаўнялі б вялікімі падаткамі. Думаю, што самага вялікага поспеху ў гэтай сферы дабіўся арлянскі самаўрад, а канкрэтна малады войт Пётр Сэльвесюк, які сумеў заахвоціць і прыцягнуць у сваю гміну вялікую інвестыцыю міжнароднай групы „IKEA", якая будзе, калі не здарыцца нічога надзвычайнага, будаваць непадалёк Орлі дрэваапрацоўчую, а ў далейшых планах і мэблевую, фабрыкі, у якіх знойдуць працу жыхары не толькі Арлянскай гміны, але і цэлага наваколля. Бюджэт гэтай гміны папоўніцца мільёнамі злотых ад падаткаў, што павінна паскорыць перабудову гміны на сучасны лад. Планаваныя ветраныя электрастанцыі ў Арлянскай і Чыжоўскай гмінах таксама павінны заўважальна ўзбагаціць гмінныя бюджэты, што павінна станоўча паўплываць на чарговыя інвестыцыі. У чэрвені гэтага года ў Нараўцы адкрыўся філіял нарваўскай суполкі „Пронар", які ў галоўным будзе выпускаць сельскагастэхніку. Прадбачваецца, што канчаткова знойдзе тут працу 250-300 асоб (зараз працуе пад 100 работнікаў), што павінна выдатна абмежаваць беспрацоўе ў Нараўчанскай і суседніх гмінах. Хаця ў бліжэйшым часе філіял „Пронару" будзе звольнены ад падаткаў, то частка індывідуальных падаткаў жыхароў Нараўчанскай гміны, што будуць працаваць у новазбудаванай фабрыцы, будзе ўжо ад самага пачатку папаўняць бюджэт іх гміны. Напэўна вялікім поспехам для вясковага самаўрада Гайнаўскай гміны будзе будова керамічнага прадпрыемства побач Трывежы, калі суполка з аўстрыйскім капіталам „Leier" здолее пераадолець цяжкасці і зрэалізуе сваю інвестыцыю. Аднак пры такіх вялікіх інвестыцыях паяўляюцца і небяспекі, хаця б пагроза хуткага знішчэння дарог, па якіх будуць давозіць сыравіну і вывозіць прадукцыю. Зараз мясцовыя самаўрады павінны хадайнічаць аб вырашэнні дарожных праблем у паразуменні з управамі павятовых, ваяводскіх і краёвых дарог.

— Тое, што колькасць жыхароў у Бельску не паменшала ў час гаспадарчых цяжкасцей, гэта таксама заслуга самаўрадавых улад, якія выдзялялі тэрыторыі інвестарам і якія адпаведнай палітыкай стараліся заахвоціць іх да новай дзейнасці, — заявіў бельскі радны Дарафей Фіёнік.

У Гайнаўцы, на жаль, колькасць жыхароў за 20 гадоў паменшала пад 10%. Вельмі моцна паменшала колькасць рабочых месц у старых прадпрыемствах (асабліва ў дрэваапрацоўчай прамысловасці, якая па ўсёй Польшчы не толькі страціла імпэт развіцця, але прайшла праз заняпад), якія раней былі рухавікамі гаспадарчага развіцця горада. Працоўныя месцы паявіліся ў новаствораных вытворчых і паслуговых гайнаўскіх суполках і гэта выратавала горад ад заняпаду. Бельску пашанцавала, бо багаты ён прадпрыемствамі, што займаліся жыллёвым і нестандартным будаўніцтвам ды рамантаваннем дарог, а якраз апошнім часам такія суполкі маглі разгарнуць сваю дзейнасць. Зараз самая багатая нашая гміна, маючы на ўвазе бюджэтныя даходы ў пераліку на душу насельніцтва (не ўлічваю Беластока), гэта Мельніцкая гміна. Бюджэт у ёй у галоўным папаўняецца мільёнамі злотых у якасці падаткаў ад тэрыторыяў пад нафтаправодам і крэйдавым кар'ерам ды ад прадпрыемстваў, што там дзейнічаюць.

Якія інвестыцыі больш патрэбныя?

Выбар інвестыцыі, на якую сродкі выдаткоўваюцца ў першую чаргу, вельмі важны для жыхароў, якіх яна непасрэдна тычыцца. Калі будуюцца дарогі ці пракладаецца каналізацыя на некалькіх невялікіх вуліцах, інвестыцыі непасрэдна кранаюць 100, 200 ці 300 чалавек. Калі рэалізуюцца агульнагарадскія інвестыцыі, тычацца яны многіх жыхароў горада. Бывае, што ў радзе трэба прымаць рашэнні наконт выбару паміж вялікімі інвестыцыямі, што тычацца бытавых спраў, культуры ці спорту. Напрыклад, цяжкі быў выбар у папярэднім скліканні ў Гайнаўцы, калі бурмістр і радныя разважалі аб будучыні невялікіх вугальных кацельняў, якія забруджвалі наваколле, і прапанове мадэрнізацыі вялікай кацельні тадышняй суполкі „Фурнель". Калі горад не рашыўся праз Прадпрыемства цеплавой энергетыкі інвеставаць у фурнелеўскую кацельню і стаць яе ўласнікам (або саўласнікам), цеплацэнтраль купіла прыватная суполка „Rindipol", а цеплавой энергіяй з яе сталі абагравацца амаль усе гайнаўскія жылыя блокі і многія ўстановы (амаль усе вугальныя кацельні, якія абагравалі жылыя блокі, былі тады ліквідаваны). Пасля, што нейкі час, суполка „Rindipol" стала павышаць цану цеплавой энергіі, а гарадскія ўлады не мелі амаль ніякага рэальнага ўздзеяння, каб абмяжоўваць павышэнні цэн, бо іх зацвярджаў адпаведны камітэт па рэгуляванні энергетыкі.

З 1 ліпеня Жыллёвы кааператыў у Гайнаўцы павышае цану за абаграванне шматкватэрных дамоў ажно на 10% і тлумачць жыхарам, што гэтая змена выклікана павышэннем цаны цеплаэнергіі суполкай „Rindipol".

Маючы зараз вялікае еўрасаюзнае дафінансаванне, гарадскія ўлады Гайнаўкі маглі б праз Прадпрыемства цеплавой энергетыкі яшчэ больш мадэрнізаваць старую цеплавую станцыю, чым гэта зрабіла суполка „Rindipol" і абмяжоўваць рост цэн цеплавой энергіі, так як гэта робіцца ў выпадку пастаўкі вады або прымання сцёкаў да ачышчальні. Канешне, заўсёды трэба рабіць выбары і магчыма, што калі б бурмістр і радныя паставілі на кантраляванне цэн цеплавой энергіі і абмяжоўванне іх росту, трэба было б адтэрмінаваць нейкую іншую вялікую інвестыцыю або некалькі меншых.

У Бельску за гарадскія сродкі мадэрнізавалася цеплацэнтраль і зараз гарадскія ўлады маюць там уздзеянне на ўстанаўлянне цэн цеплавой энергіі для шматпавярховых блокаў.

— Калі цяпер ніжэйшая цана вугалю, панізілася цана цеплаэнергіі з нашай цеплацэнтралі ў Бельску, што мадэрнізавалася між іншым за гарадскія сродкі. Наш магістрат кантралюе цеплацэнтраль, а яе фінансавыя вынікі паказваюцца таксама нам, радным. Кіраўніцтва цеплацэнтралі атрымлівае прэстыжныя ўзнагароды, між іншым за станоўчае ўздзеянне на ахову асяроддзя і за ўзорныя адносіны да работнікаў, — сказаў бельскі радны Дарафей Фіёнік.

Зараз пэўна малыя магчымасці, каб Прадпрыемства цеплавой энергетыкі з Гайнаўкі магло пераняць на ўласнасць цеплацэнтраль суполкі „Rindipol", якая ўклала немалыя грошы ў яе мадэрнізацыю. Аднак, надалей ёсць магчымым, каб гайнаўскія ўлады рашыліся будаваць новую цеплацэнтраль, паколькі надалей кантралююць гарадскую сетку, якой перасылаецца цеплаэнергія.

Да 110-годдзя славутага беларускага спевака і педагога

Міхась Забэйда -Суміцкі ў Варшаве

Сяргей ЧЫГРЫН

У 1935 годзе выдатны беларускі оперны спявак Міхась Забэйда-Суміцкі (1900-1981) падпісаў кантракт з Познаньскім оперным тэатрам на адзін год. Але праца ў Познаньскай оперы, як піша ў кнізе „Песняй даваў людзям радасць" (Мінск 2007, с. 29) яе аўтар Алесь Горбач, пакінула не самыя лепшыя ўспаміны. На „крэсах усходніх" польскія санацыйныя ўлады праводзілі тады шалёную паланізацыю, беларусаў як нацыю не прызнавалі, не ў пашане, мякка кажучы, была і беларуская песня. Міхась Забэйда-Суміцкі ж ніколі не хаваў таго, што ён беларус, не цураўся роднай мовы і песні. У Познані давялося яму шмат вытрываць, бо бывала, што тыднямі спевака не пускалі на сцэну, кпілі з ягонай беларускасці. Таму пасля заканчэння кантракта ён пакінуў Познаньскую оперу і пераехаў у Варшаву, дзе пачаў выступаць з канцэртамі і спяваць на польскім радыё.

І ў Варшаве да беларускага спевака адносіліся па-рознаму. Спачатку нават смяяліся, што такі добры артыст, спявак італьянскай школы, а ў свае канцэртныя праграмы ўключыў мужыцкія песні. Але з цягам часу, як згадваў у сваіх успамінах Міхась Забэйда-Суміцкі (Альманах „Белавежа", № 1, Беласток 1965, с. 304), на яго канцэрты не толькі ішлі слухаць, але прыязджалі людзі за дзесяткі кіламетраў, каб пачуць у яго выкананні гэтыя мужыцкія песні. „Адзін раз я спяваў у польскім радыё праграму, якую перад гэтым выконваў славуты Кепура. І вось пасля майго выступлення, між іншым, напісалі: „У Забэйдзе-Суміцкім Кепура знайшоў небяспечнага канкурэнта", — успамінаў спявак. Былі і такія, што ўгаворвалі Міхася адмовіцца ад беларускай песні. Але Міхась Забэйда быў няўмольны.

Вядома ж, да беларускага спевака ў Варшаве адносіліся і вельмі добра, шчыра, нават падтрымлівалі. Да такіх людзей належаў музычны дырэктар Варшаўскага радыё Эдмунд Рудніцкі. Дзякуючы яму Міхась Забэйда-Суміцкі ў 1938 годзе ўпершыню наспяваў на грамафонныя кружэлкі дзесяць беларускіх песень. Гэта былі песні „Ляціць сарока", „Конь бяжыць", „Ой, рана куры запелі", „Шчука-рыба ў моры" (кампазітар Аляксандр Грачанінаў), „Як памерла матулька", „Рабіна", „Лявоніха" (кампазітар Аляксей Туранкоў), „Зялёны дубочак", „Чаму ж мне не пець" (кампазітар Станіслаў Казура), „А ў лесе, лесе..." (кампазітар Міхал Анцаў). Пасля выхаду кружэлкі прыйшлі сапраўдны трыумф, надзея, поспех. У сувязі з такой падзеяй Рыгор Шырма пісаў: „Гэтыя песні разышліся і вандруюць далёка за межамі бацькаўшчыны да нашых братоў-эмігрантаў у Францыю, Амерыку, Аргенціну, пояць іх там сваёй жыватворчай сілай, дарагім вадгалоскам далёкай роднай зямлі" (Рыгор Шырма, *Песня — душа народа*, Мінск 1993, с. 116).

Гэтыя кружэлкі даволі вялікай папулярнасцю карысталіся і ў Беларусі, асабліва ў заходняй яе частцы. Выступленні Міхася Забэйды-Суміцкага па Варшаўскім радыё трансліравалі Парыж, Лондан, Прага, Нью-Йорк і іншыя радыёстанцыі. Пасля выступленняў па радыё спявак у Варшаве атрымліваў сотні пісем з усіх куткоў свету. А адзін лонданскі радыёчасопіс, як згадваў у сваіх успамінах наш зямляк, змясціў яго фотаздымак і артыкул пад загалоўкам „Спявак, які сам сябе зрабіў". Праўда, не ўсім беларускія радыёпесні ў Польшчы падабаліся. Часопіс „Шлях моладзі" (1937, № 16, с. 13) пісаў: „16 лістапада з Варшавы на ўсе радыёстанцыі ў Польшчы быў надаваны канцэрт беларускіх песняў (нешта каля 7 песняў), якія сьпяваў ведамы на ўвесь сьвет сьпявак М. Забэйда. Дакладная праграма гэтага канцэрту была пададзена ў афіцыяльным органе Польскага Радыё „Antena". Беларусы і многалічныя паклоньнікі беларускай песьні, хто толькі мог сходзіліся пры радыёвых апаратах слухаць прыгожага сьпеву. І што ж сталася? Вось жа Віленская радыёстанцыя па трэцяй ужо беларускай песьні, бяз аглядкі на забавязаньні агульнавызначанай наперад праграмы, узяла ды выключыла сваю антэну з перадачы агульнай, і з сваёй радыёстанцыі, чамусьці вельмі падэнэрваваным голасам, абвясьціла, што ўжо надала аўдыцыю „песьняў палескіх" ды што прыступае да ігры з грамафонам плітак: „wesele góralskie", „umarł Maciek" і інш. Уся гэта „аўдыцыя" з грамафонных плітак трывала да тае хвіліны, пакуль у Варшаве сьпяваў М. Забэйда. Гэтак Віленская радыёстанцыя яшчэ раз выявіла свае сапраўдныя адносіны да беларускіх песьняў, а тым самым і да таго народу, каторы іх пяе і каторага культурныя патрэбы мусіла б браць перад усім пад увагу".

Тым не менш, Міхась Забэйда-Суміцкі стаў вельмі папулярным спеваком у Польшчы. Польскія кампазітары дасылалі спеваку песні з просьбамі, каб ён выконваў іх на сваіх канцэртах. У яго рэпертуары былі арыі з опер, араторыі, кантаты, песні і рамансы розных народаў і стыляў — ад класікаў да тагачасных кампазітараў. Беларускі спявак вельмі шмат выступаў. Радаваў ён песняй у Варшаве і беларусаў. Вось што пісалі беларускія часопісы пра канцэрты Міхася Забэйды-Суміцкага ў Варшаве: „27 лютага у залі Варшаўскай кансерваторыі адбыўся канцэрт песьні. Выступаў слаўны тэнар Міхась Забэйда-Суміцкі. З прасьпяваных ім песень найлепш спадабаліся публіцы песьні беларускія" („Шлях моладзі", 1937, № 3, с. 22). „Канцэрты М. Забэйды-Суміцкага адбыліся ў Вільні 8 мая і ў Варшаве 24 мая. У іх праграме апрача розных іншых твораў, былі і беларускія народныя песьні. Як заўсёды, найпрыхільней, з захапленьнем, былі прынятыя публікаю беларускія песьні ў вельмі мастацкім выкананьні нашага слаўнага сьпевака" („Беларускі летапіс", 1938, № 2, с. 42). „Апошні час артыст стала жыве ў Варшаве, выступае на сталічных сцэнах, у Польскім радыё, выязджае часта з канцэртамі на правінцыю і заграніцу. Прычым на кожным канцэрце слаўнага артыста разам з ім выступае беларуская песьня, выступае ў поўным блеску і красе, карыстаецца калясальным посьпехам побач з шэдэўрамі музыкі эўрапейскай. Так на канцэрце ў Варшаўскай кансерваторыі 27 лютага г.г. дзьве беларускія народныя песьні А. Грэчанінава „Ляціць сарока" і „Конь бяжыць, зямля дрыжыць" зрабілі калясальнае ўражаньне на публіку. Артыст быў змушаны паўтарыць іх...", — пісаў Рыгор Шырма ў часопісе „Беларускі летапіс" у красавіку 1937 года.

Пра канцэрт у Варшаве ў траўні 1938 года прыгадваў у сваіх успамінах і Пятро Ластаўка, якія друкаваліся ў тыднёвіку „Ніва" 8 сакавіка 1957 года: „У траўні 1938 года Асветнае таварыства беларусаў у Варшаве сарганізавала публічны канцэрт у Варшаўскай кансерваторыі вядомага беларускага спевака М. Забэйды-Суміцкага. Тут трэба падкрэсліць, што беларускі канцэрт зрабіў вялікае ўражанне ў Варшаве. Зала кансерваторыі была перапоўнена, а артыст вымушаны быў па просьбе слухачоў паўтарыць амаль кожную беларускую песню. Прэса варшаўская ў сваіх рэцэнзіях пісала, што даўно ўжо не было такога добрага канцэрта ў сталіцы, а выходзячыя з канцэрта гаварылі між сабой, што і беларусы маюць свайго Кепуру, і вось, каб часцей беларускія песні тут пялі, надта ж яны прыгожыя".

У Варшаве ў Міхася Забэйды-Суміцкага было шмат творчых планаў і спадзяванняў. Але ўсяму гэтаму перашкодзіла Другая сусветная вайна. Аднойчы спявак патрапіў пад серыю бамбёжак і нямецкіх абстрэлаў. Але выратаваў з бяды яго стрыечны брат Язэп Урбановіч. Той самы Язэп Урбановіч (1907-1944), які прымаў актыўны ўдзел у нацыянальна-вызвольным руху ў Заходняй Беларусі. Калі ён вярнуўся з Варшавы на Ружаншчыну — з'яўляўся адным з кіраўнікоў партызанскага руху на Берасцейшчыне. Загінуў у ліпені 1944 года за некалькі дзён да прыходу савецкіх салдат ад рук партызанаў-марадзёраў, якія рабавалі царкву ў вёсцы Варанілавічы на Пружаншчыне.

У маім хатнім архіве захоўваецца копія пісьма Міхася Забэйды-Суміцкага да Басі Кнубовец — жонкі Язэпа Урбановіча, якая ў сярэдзіне 1980-х гадоў жыла ў Гродне. Нават і не памятаю, хто мне яго і калі даслаў. Ліст вельмі цікавы. Ён мае непасрэднае дачыненне да Варшавы і нашага спевака. Пісьмо да спадарыні Кнубовец напісана ў Празе 18 красавіка 1969 года. Міхась Іванавіч пісаў наступнае:

«Дарагая Бася! Адказваю адразу на Ваша пісьмо ад 9 г/м. Ліст гэты я чакаў доўга, так як хацеў скарыстацца Вашай памяццю, якая лепш за маю, каб адказаць на просьбу т. Фактаровіча пра Юзіка [Аляксандр Фактаровіч (1935-1979) — беларускі вучоны і гісторык. Юзікам усе сябры называлі Язэпа Урбановіча — С. Ч.]. Не дачакаўшыся Вашага адказу, я 23 сакавіка напісаў яму прыблізна такі ліст: Паважаны Аляксандр Аляксандравіч! Нягледзячы на неспры-

працяг ☞ 11

Вокладка часопіса „Беларускі летапіс" з партрэтам спевака, 1937 г.

Пасля першага тура

Выбары адбыліся згодна з міжнароднымі і краёвымі правіламі. Некаторыя прынцыпы, былі, аднак, парушаны, — да такіх высноў дайшлі маладыя назіральнікі з замежжа, галоўным чынам з Беларусі, якія наведалі больш за 170 выбарчых участкаў у час першага тура прэзідэнцкіх выбараў у Беластоку і гмінах Падляшскага ваяводства.

На здзіў шмат якіх палітолагаў, сацыёлагаў і журналістаў, прыглядаючыхся польскаму палітычнаму жыццю, у тых падляшскіх гмінах, дзе ў рашучай большасці пражывае беларуская меншасць, 20 чэрвеня перамог маршалак Сейма Браніслаў Камароўскі; у некаторых з іх атрымаў нават тройчы больш галасоў чым Гжэгаж Напяральскі (лідар СЛД), кандыдат лявіцы, групоўкі, на якую дагэтуль традыцыйна ўжо галасавалі тут у час дасюлешніх прэзідэнцкіх, парламенцкіх і самаўрадавых выбараў. Ва ўсім Падляшскім ваяводстве (пасля падліку вынікаў з усіх гмін; даныя падаем акругленыя) перамог лідар ПіС Яраслаў Качынскі (43%), перамагаючы Браніслава Камароўскага (36%). Гжэгаж Напяральскі атрымаў 12% галасоў. Прысутнасць у рэгіёне склала 51,7%. У Гайнаўскім павеце цяперашні маршалак Сейма пакарыстаўся падтрымкай каля 60% галасуючых, а Гжэгаж Напяральскі крыху больш за 20%; Яраслаў Качынскі — 12%. У паасобных „беларускіх" гмінах Гайнаўскага павета падтрымка надзеленая маршалку Камароўскаму перавысіла 60% — у Чыжах (64%), Кляшчэлях (61%), Нараўцы (65%). У Бельскім павеце, у гміне Орля — 63%. У самім Бельску-Падляшскім Браніслаў Камароўскі атрымаў 48% галасоў, у Сямятычах 44%. У гміне Сямятычы выйграў Яраслаў Качынскі. Гжэгаж Напяральскі найбольш галасоў атрымаў у гмінах Гайнаўка (24%), Чаромха (23%), Чыжы (20%) ды ў горадзе Гайнаўка (21%). У горадзе Беластоку ў першай чацвёрцы пераможцаў першага тура апынуліся Браніслаў Камароўскі (45%), Яраслаў Качынскі (35%), Гжэгаж Напяральскі (12%) і Януш Корвін-Міке (3%). Палітолагі і сацыёлагі перамогу ў паўднёва-ўсходняй частцы Падляшша тлумачаць у першую чаргу фактам падтрымкі, якую Браніславу Камароўскаму аказалі Владзімеж Цімашэвіч і мітрапаліт Сава, хоць не ўсе выбаршчыкі кіраваліся тымі падказкамі. Сярод іх быў дэпутат Лявіцы Яўген Чыквін:

— Я галасаваў на Гжэгажа Напяральскага, — прызнаўся „Ніве" і адной з мясцовых радыёстанцый.

Калі Дзяржаўная выбарчая камісія падала ў паслявыбарчы панядзелак інфармацыю пра вынікі галасавання, у рэдакцыі Радыё Рацыя ў Беластоку адбылася прэс-канферэнцыя прадстаўнікоў назіральнай місіі, галоўным чынам з Беларусі, а таксама з Літвы і Швецыі. Больш за трыццацёх маладых людзей наведала польскія выбарчыя ўчасткі ў рамках праграмы „Назіранне выбараў: тэорыя і практыка". Ва ўступным рапарце заўважылі яны, што „прынцыпы захавання таямніцы галасавання, згодна з міжнароднымі правіламі, змяшчаючыміся ў польскім заканадаўстве, не заўсёды захоўваліся", а камісіі не высвятлялі выбаршчыкам прынцыпаў тайнасці пры выдачы картаў. „Зразумення прынцыпу тайнасці не хапае таксама сярод выбаршчыкаў. У адным з выбарчых участкаў журналіст TVN24 рабіў рэпартаж, фільмаваў некаторых выбаршчыкаў, калі яны былі ў пункце запаўнення карт", — звярнулі ўвагу назіральнікі. Кабіны, дзе закрэслівалі кандыдатаў, не былі сканструяваны так, каб гарантаваць тайнасць. Апрача таго ў некаторых участках не быў гарантаваны доступ для інвалідаў, пломбы на ўрнах былі выкананы неадпаведна, а часам на іх былі відочныя знакі ранейшага выкарыстання. У некаторых вёсках галасавалі без паказвання дакументаў. Пры перапаўненні ўчастка выбаршчыкамі неаднойчы не хапала дастатковага ліку членаў камісіі, каб паспяхова рэгуляваць пераплыў людзей. Выступалі таксама выпадкі сямейных ці групавых галасаванняў. Ва ўступным рапарце назіральнкі прыпомнілі: „Сямейнае галасаванне забаронена па прычыне такой сітуацыі, калі, напрыклад, муж хоча кантраляваць выбар жонкі".

— Гэта, што найважнейшае, вынікі выбараў адлюстроўваюць рэчаіснасць і камісіі не маюць уплыву на вынікі, а тым больш іх фальшавання, — гаварыла ў час прэс-канферэнцыі каардынатарка праекта Настасся Матчанка. — Прыходзілася камісіям па некалькі разоў пералічваць галасы. Можа гэтая працэдура не ідэальная, але яна на высокім узроўні.

Аліна Новік, якая кіравала групай з трох асоб, назіраючай выбары ў Гайнаўскім павеце, з якой „Ніва" аб'язджала выбары 20 чэрвеня (пісалі мы аб гэтым тыдзень таму), ацаніла факт, што выбарчы ўчастак у Будах змяшчаўся ў памяшканні прызначаным на каталіцкую капліцу:

— Мы не рабілі б з гэтага вялікай праблемы. Такая практыка здараецца, напрыклад, у Нарвегіі, дзе ў пратэстанцкіх касцёлах выдзяляюцца выбарчыя месцы. Ведаем прынцып аддзялення палітыкі ад рэлігіі. Але аб такіх выпадках, як у Будах, павінны рашаць самі палякі.

Дадала:

— Ацэньваем, што прысутнасць не была завялікая, але калі хто хацеў галасаваць, той мог. Шмат асоб пакарысталася пасведчаннямі з месцаў пражывання. У Белавежы ў адным з участкаў, калі мы туды трапілі, зрабілі гэта ўжо 123 асобы. Дзіўнай была непрысутнасць мужоў даверу, такіх польскіх назіральнікаў.

Рапарт з выбараў будзе перададзены Акруговай выбарчай камісіі. На жаль, вывады з яго вынікаючыя не маюць фармальна-юрыдычнай сілы. Аднак Настасся Матчанка спасылаецца на прыклад Нарвегіі, калі заўвага пасля адных з выбараў стала прадметам дэбаты ў парламенце. У выбарчых участках, якія „Ніва" наведала з назіральнікамі, выйграў таксама Браніслаў Камароўскі. Напрыклад, у Доме культуры ў Гайнаўцы атрымаў ён 723 галасы, Гжэгаж Напяральскі — 275, а Яраслаў Качынскі — 76. У Гайнаўскім белліцэі адпаведна: 481, 156 і 161. У комплексе школ у Дубінах: 237, 66 і 27. Урэшце, у згаданых Будах: 42, 22 і 19.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Беларуская незалежная журналістыка, нягледзячы на амаль татальнае вынішчэнне яе лукашэнкаўскім рэжымам, усё ж „хутчэй жывая, чым мёртвая". Дзякаваць за тое можна хіба толькі самім журналістам і іх сродку камунікацыі з патэнцыйнымі чытачамі — інтэрнэту.

„Ніва" ўжо неаднойчы пісала пра розныя выданні, што існуюць з большага ў віртуальнай прасторы, не маючы папяровай версіі. Праўда, у такім існаванні ёсць адзін вялікі мінус — хоць інтэрнэт-прастора з кожным імгненнем пашырае свае межы, але далёка не кожны карыстальнік, бывае, зацікавіцца нечым новым сярод той безлічы інфармацыйна-аналітычных парталаў, якімі запоўнены Байнэт. А многія асобы не так часта карыстаюцца інтэрнэтам, таму могуць папросту не даведацца аб існаванні таго ці іншага віртуальнага выдання. Таму найлепшым выйсцем тут бачыцца сімбіёз — існаванне сайта і папяровая версія выдання, хай сабе нідзе і не зарэгістраванага — такога, напрыклад, як газета „Тут і цяпер".

Сайт данай газеты месціцца ў сеціве па адрасе http://svabodaby.net. Без перабольшання можна сказаць, што сайт зроблены вельмі прафесійна — на першы погляд падаецца, што гэта інтэрнэт-старонка выдання, якое лёгка набыць у кожным шапіку, якое мае шырокае кола сваіх чытачоў, што ўжо не адзін год чытаюць яго. Насамрэч газета мае архіў, які пачынаецца з верасня 2009 года.

Што ж тычыцца выходных даных, то на сайце іх знайсці немагчыма. Для таго, каб даведацца больш аб „Тут і цяпер", прыходзіцца адкрываць pdf-версію газеты. Толькі там можна прачытаць, што наклад выдання 299 асобнікаў, а каб патрымаць яго ў руках, трэба адаслаць sms-паведамленне на нумар з літоўскім кодам.

Калі ж звярнуць увагу на змест артыкулаў, то яны сапраўды годныя быць прадстаўленымі ў многіх цэнтральных беларускіх газетах. Асабліва гэта тычыцца такіх рубрык, як „Тэма", „Палітыка", „Эканоміка".

Найбольш уражвае той факт, што нягледзячы на такое няпэўнае існаванне — толькі 299 асобнікаў і сайт у інтэрнэце — „Тут і цяпер" змяшчае артыкулы з рэгіёнаў Беларусі. Абсалютная большасць рэгіянальных допісаў — з Магілёва. А напрыклад з Віцебска — ніводнага.

Наяўнасць на сайце такой рубрыкі як „Спорт" можна асэнсоўваць як заяўку на стварэнне ў будучым шматпалоснай сур'ёзнай газеты нацыянальнага маштабу, якая прадставіць чытачу больш-менш поўны агляд найважнейшых падзей з розных бакоў жыцця Беларусі.

Сайт газеты змяшчае рубрыку „Фотафакт". Збольшага там месцяцца фотаздымкі, што маюць афіцыйную нагоду, кшталту візітаў у Мінск прэзідэнта Азербайджана ці прэм'ер-міністра Італіі. Праўда, ёсць і такія рамантычна-лірычныя як захад сонца над беларускай сталіцай.

Старонка „Погляд" — гэта своеасаблівая прэзентацыя рознымі аўтарамі сваіх артыкулаў, што месцяцца ў іншых рубрыках на сайце. Пазначаных аўтараў усяго трое.

Цяпер практычна кожны сайт выдання камунікуе з карыстальнікамі праз форумы ці прадастаўляе магчымасць для чытачоў дасылаць каментарыі да асобных артыкулаў. Такая магчымасць прадугледжана і на „Тут і цяпер", праўда, пачытаўшы гэтыя каментарыі, падаецца, што ўладальнікі сайта не спяшаюцца пакуль задзейнічаць прэмадэрацыю.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Разгар жарсцяў

1/8-я футбольнага чэмпіянату свету парадавала жарсцю і колькасцю галоў і засмуціла арбітражам. Мундыяль яшчэ далёкі да свайго завяршэння, але ўжо зараз можна назваць яго галоўных антыгерояў — гэта кіраўніцтва ФІФА на чале з Ёзэфам Блатэрам, якое ўпарта адмаўляецца ўводзіць у практыку відэапаўторы і тым самым стварае скандалы.

Уругвай — Паўднёвая Карэя — 2:1. Уругвайцы ніколі не прайгравалі сваім апанентам і былі фаварытамі. Нашчадкі чаруа праводзілі чацвёрты матч — і ўсе супраць зборных з розных кантынентаў. Так зладжана як спяваюць нацыянальны гімн уругвайцы, не спявае хіба ніхто. Можа таму і гульня ў іх атрымліваецца. У дэбюце істотная перавага „селесты" ўвасобілася ў хуткі гол Луіса Суарэса. Пару памылак арбітра перашкодзілі ўругвайцам развіць поспех. А ў другім тайме зарадзіў густы дождж і характар матча істотна перамяніўся. Ініцыятывай трывала заваладалі карэйцы, што прывяло да лагічнага гола — першая „прабоіна" ўругвайскага карабля на турніры. Вырашальным стала больш высокае індывідуальнае майстэрства. Луіс Суарэс заблытаў абаронцаў і па дузе запусціў мяч у сетку.

Гана — ЗША — 2:1. Змаганне зборных ЗША і Ганы было яшчэ больш зацятым. Узяць рэванш за паразу на мінулым мундыялі зорна-паласатым не ўдалося. „Чорныя зоркі" рэалізавалі свае шанцы, амерыканцы — не. Каманду Мілана Раеваца выратоўваў брамнік Рычард Кінгсан, а вось яго амерыканскі калега Цім Ховард двойчы згуляў няўдала. Спярша галавым уколам вызначыўся Кевін-Прынс Баатэнг. Далей янкі несупынна штурмавалі абарончыя рэдуты ганцаў і ўрэшце дамагліся пенальці, які рэалізаваў Лэндан Донаван (3 гол на турніры, а ўсяго 5 на мундыялях — нацыянальны рэкорд). У дадатковы час даціснуць ганцаў не атрымалася — афрыканцы правялі эфектную контратаку, якую трапна завершыў Азамоа Г'ян. Гана ўпершыню ў гісторыі выйшла ў чвэрцьфінал, дзе спаткаецца з Уругваем. Сімпатычная ж каманда Боба Брэдлі пакідае чорны кантынент.

Германія — Англія — 4:1. Сустрэча пацвердзіла, што ангельская зборная элементарна была негатовая да чэмпіянату. Да такой разбалансаванасці прывёў цяжкі клубны сезон. Бундэстым досыць хутка рэалізаваў бліц-крыг. Спярша Міраслаў Клозэ скарыстаўся „парашутам" ад свайго брамніка Мануэля Нойера і забіў 50-ы гол за „маншафт" і 12-ы гол на мундыялях (па апошнім паказніку дагнаў самога Пеле). Затым не прамінуў адзначыцца і Лукаш Падольскі — 40-ы гол за зборную. А далей было хвілін 10 усплёску Англіі, гол галавой у чыста брытанскім стылі Мэцью Апсана і амаль услед яшчэ адзін Фрэнка Лэмпарда. У гэтым разе мяч трапіў у папярэчыну і адскочыў за лінію на паўметра. Гэта бачылі ўсе, акрамя ўругвайскіх арбітраў, якія не залічылі гола. Пасля перапынку немцы лёгкімі контратакамі і двума кантрольнымі стрэламі Томаса Мюлера дабілі саперніка. Нямеччына ажно 15-ы раз запар выйшла ў чвэрцьфінал!

Аргенціна — Мексіка — 3:1. Ацтэкі спярша дамінавалі, апярэджвалі апанентаў і былі бліжэй да радасці. Не пашанцавала. А далей ім гульню „паламала" судзейская брыгада з Італіі, якая залічыла гол з афсайду Карласа Тэвеса. Услед сказаў важкае слова бамбардыр „альбіселестэ" Гансала Ігуаін — 4-ы гол на турніры. У 2-м тайме „гарматнае ядро" запусціў Тэвес. Мексіканцы, як сапраўдныя воіны, змагаліся да апошняга і Хаўер Эрнандэс забіў бліскучы гол прэстыжу. Мексіка пяты раз запар выбывае на стадыі 1/8-й. У чвэрцьфінале Аргенціна сустрэнецца з Нямеччынай.

У 1/8-й таксама згулялі пазней **Нідэрланды — Славаччына, Бразілія — Чылі, Парагвай — Японія, Іспанія — Партугалія.**

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

9 ☞ працяг

Міхась Забэйда

яльныя ўмовы (хвароба, узрост), паспрабую выканаць Ваша жаданне і напісаць успаміны пра Іосіфа Паўлавіча, майго стрыечнага брата. Знаёмства наша пачалося „на адлегласці". Аднойчы ў Харбіне, дзе я працаваў у савецкай школе, я атрымаў пісьмо. Пісаў яго Юзік. Было яму 14-15 гадоў. Ён пытаўся ў мяне, што яму рабіць. Бацькі застаўлялі яго працаваць па гаспадарцы. А Юзік хацеў вучыцца. З ліста было бачна, што ў яго ёсць усе дадзеныя на тое, каб працягваць адукацыю. У сваім адказе я падтрымаў яго жаданне вучыцца. Ён так і зрабіў...

Прайшло шмат гадоў. Многа было перажыта мною і Юзікам. Нарэшце, мы з ім сустрэліся ў Варшаве, дзе пасля вяртання з Італіі, я працаваў як спявак у 1936-1939 гадах.

Наша першая сустрэча вельмі зблізіла. Ён шмат чуў і чытаў пра тое, што я не толькі застаюся беларусам, верным свайму народу, але і ў сваіх канцэртах, нягледзячы на шматлікія перашкоды, выкарыстоўваю беларускія народныя песні. У сваю чаргу ў Шэйпічах [родная вёска М. Забэйды-Суміцкага і Язэпа Урбановіча на Пружаншчыне — С. Ч.] я даведаўся, што ён вельмі пацярпеў, змагаючыся за шчасце свайго народа, сваёй Радзімы. Гэта дапамагло нам адразу быць шчырымі і адкрыта размаўляць пра тое, як у санацыйнай Польшчы прыгнятаюць нашых братоў-беларусаў і як трэба з гэтым змагацца...

Ён вельмі душэўна перажываў несправядлівасці, звязаныя з культам асобы Сталіна, адмаўляў яго, лічыў, што з гэтым трэба змагацца.

У Варшаве было Асветнае таварыства беларусаў, якое, між іншым, наладжвала канцэртныя праграмы. У арганізацыі такіх мерапрыемстваў прымаў удзел і Іосіф Паўлавіч. Ён вельмі любіў беларускія народныя песні і часта прасіў мяне што-небудзь праспяваць. Часам сам падпяваў. Вось дзве з гэтых песень:

***

Ой, у полі азерца,
Там плывала вядзерца.
Прыхадзі, мілы, не тамі мяне,
Ды пацеш маё сэрца.
Ці ж я не такая,
Як і тая другая.
Я й харошая, я й прыгожая,
Толькі доля ліхая...

***

Ой, пайду я лугам, лугам,
Дзе мой мілы арэ плугам.
Занясу яму я есці,
Ці не скажа ён мне сесці.
Занясу яму я піці,
Ці не будзе гаварыці.
Ён наеўся і напіўся,
Сеў на ролю й зажурыўся.
Што ты, мілы мой, думаеш,
На мяне не паглядаеш?
А я сяджу ды думаю,
Што нялюбу жонку маю.
Браў мяне ты ўдзень, не ўночы,
Дзе ж тады свае меў вочы?..

Размаўлялі мы між сабой заўсёды на роднай беларускай мове. Ён лічыў, што без роднай мовы няма народа як нацыі. Памятаў словы Ф. Багушэвіча: „Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі". Вельмі любіў Янку Купалу і Якуба Коласа.

Летам у добрае надвор'е мы разам хадзілі ў Лазенкі — вялікі парк у Варшаве. Па дарозе спыняліся каля помніка Шапэна, музыку якога ён вельмі любіў.

Аднойчы мы сядзелі разам пад дрэвам у Лазенках. І раптам да нас прыбегла вавёрачка, і, так як мы не варушыліся, залезла яна на калені да Іосіфа Паўлавіча. Гэта яго вельмі ўзрадавала. Дарэчы, мы шмат размаўлялі пра давер. Трэба адзначыць, што Іосіф Паўлавіч не толькі ўмеў добра гаварыць, але і ўмеў слухаць людзей, нават і тады, калі не пагаджаўся з тым, пра што той казаў. У надзеі, што Вы не забыліся беларускай мовы, прывяду адзін выпадак, пра які я пісаў у сваіх „Успамінах", надрукаваных у альманаху „Белавежа" (Беласток, 1965, № 1): „Вайна захапіла мяне ў Варшаве. Як вядома, нямецкія фашысты хутка акружылі горад і сталі бамбіць яго і абстрэльваць. І вось мне ўспамінаецца гераічны ўчынак майго стрыечнага брата Язэпа Урбановіча. Ён з адным таварышам прабраўся праз акружэнне і пранік у Варшаву, каб вывесці мяне з пекла, у якім я апынуўся. На жаль, я быў хворы і не мог ісці. Крануты дабразычлівасцю, я падзякаваў яму за чалавечыя адносіны да мяне і пры развітанні сказаў, што хоць застаюся ў Варшаве, але душой буду заўсёды з ім. Так яно і было...". Гэта была мая апошняя сустрэча з Іосіфам Паўлавічам. Я вельмі рады, што Вы захапіліся вывучэннем жыцця і дзейнасці гэтага цудоўнага чалавека і жадаю Вам поўнай удачы ў працы. З павагай М. Забэйда».

Так у Варшаве Міхась Забэйда-Суміцкі цудам застаўся жыць. Ён прабыў там адзін год. І вясной 1940 года па запрашэнню Народнага дома выехаў у Прагу.

Бяспечныя канікулы

Уладзімір СІДАРУК

8 чэрвеня гайнаўскія паліцэйскія супольна з Комплексам школ у Дубічах-Царкоўных у рамках праграмы „Бяспечныя канікулы" арганізавалі фэст для дзяцей. На імпрэзе вучылі дзетак прынцыпаў бяспечнага адпачынку ў час канікулаў. Над вадаёмам Бахматы прайшлі спаборніцтвы і шматлікія конкурсы. Гітам быў талісманчык „Дабромісь", які ахвотна пазіраваў да здымкаў з малечамі ды раіў дзеткам як сябе прыкладна весці. Мерапрыемства, якое праводзілася пад апекай паліцыі, завяршылася прэзентацыяй паліцэйскага рыштунку і абучэннем службовых сабак.

Увага — пагроза!

21 траўня гайнаўскія паліцэйскія ў рамках адукацыйнай праграмы „Увага — пагроза" і „Стоп паталогіям" сустрэліся з вучнямі Пачатковай школы і Гімназіі ў Дубінах. Паліцэйскія і стажоры гаварылі з вучнямі аб насіллі ў час падарожжа ў школу і дамоў, таксама аб злачынасці і парушэннях правапарадку малалеткамі ў крузе аднагодкаў, як і аб ітэрнэтавым насіллі. Вучні і гімназісты абмяркоўвалі пагрозы і здарэнні, якія выступаюць у школе і аб тым, як вырашаць такія праблемы. Адначасова паліцэйскія знаёмілі з законамі, якія вызначаюць адказнасць малалетак за парушэнне закону.

Злачынца затрыманы

18 траўня непадалёк Чаромхі паліцэйскія затрымалі 27-гадовага жыхара Бельска-Падляшскага, які папрасіў добразычлівага 24-гадовага шафёра легкавіка падвезці, затым абяссіліў яго паралізатарам, украў партфель з дакументамі і 2000 зл., выскачыў з аўтамабіля і ўцёк у лес. Раней ударыў яшчэ ахвяру ў галаву парожнім балончыкам з-пад газу. У выніку гэтага шафёр атрымаў невялікія пашкоджанні галавы і вачэй. Злачынца быў затрыманы гайнаўскай паліцыяй. У час допыту прызнаўся, што падобнае злачынства ўчыніў у сакавіку гэтага года на беларускім турысце. Тады пазбег адказнасці. Зараз стане перад судом.

Вось як злачынца адплаціўся чалавеку за яго добразычлівасць.

Разлічвалі на прыбытак

8 чэрвеня функцыянеры гайнаўскай паліцыі, кантралюючы тэрыторыю нядзейснай чыгуначнай лініі Гайнаўка — Белавежа прыкмецілі побач пуці двух асобеняў. Калі гэтыя ўгледзелі паліцэйскіх, дык пачалі ўцякаць. Неўзабаве былі затрыманы. Аказаліся імі 22- і 24-гадовы жыхары Гайнаўкі. У час кантролю пры затрыманых былі знойдзены адзінаццаць падкладак для мацавання пуці, МП3-плэер і піва. Зладзеі адкручвалі падкладкі і папівалі піва пад музыку. У суботу сюдою мела праехаць старадаўняя дрызіна ў рамках святкаванняў Дзён тэхнікі. Брак так важных дэталей на пуці мог бы стаць прычынай аварыі і дрызіна магла б сысці з рэек. Вось да чаго прыводзіць людская лёгкадумнасць.

Адгаданка

	1	2	3	4	5		6	7	8	9	10	11
		12	13	14		15	16	17	18	19	20	21
22	23	24	25	26	27		28	29	30	31	32	33
				34		35	36	37	38	39	40	41
42	43	44	45	46	47		48	49	50	51	52	53

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм Аскара Уайльда.

1. раённы цэнтр між Віцебскам і Лепелем = 24 _ 2 _ 12 _ 5 _ 1 _ 7 _ 14 _ 48 _ 33 _ 38 _ 39 _;
2. Бернхард, германскі канцлер у 1900-1909 гг. = 44 _ 43 _ 42 _ 10 _ 11 _;
3. орган з саскамі ў самак млекакормячых = 28 _ 21 _ 52 _ 25 _;
4. муж дачкі = 9 _ 45 _ 46 _ 47 _;
5. хлусня = 32 _ 31 _ 40 _ 49 _;
6. адвага, храбрасць = 35 _ 29 _ 15 _ 20 _ 34 _ 6 _ 26 _ 27 _;
7. не айчына = 18 _ 36 _ 37 _ 19 _ 17 _ 16 _;
8. вялікі горад у Забайкаллі = 50 _ 41 _ 13 _ 51 _;
9. сузор'е, з якога Сонца пачынае восень = 30 _ 8 _ 22 _ 53 _;
10. сорт моцнай, спецыяльна апрацаванай скуры = 23 _ 3 _ 4 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 22 нумара

Фартух, крыўда, жалеза, каліна, пеня, Рона, дама, Леман, жур, Энкі, ерась, мяжа, Лерыда, калека, Сафокл.

Рашэнне: **Калі пры ўладзе хамелеон, акружэнне мяняе колеры.**

Кніжную ўзнагароду высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2010 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 250 egz.

Простыя дадаткі да агіяграфіі бласлаўлёнага Папялушкі

Фота і тэкст
Ганны КАНДРАЦЮК

(пачатак у № 24)

Нельга быць прарокам у сваёй айчыне — вучыць біблейская мудрасць. Яшчэ горш быць прарокам у сваёй вёсцы і парафіі — пра гэта мы даведаліся на месцы: у Сухаволі і навакольных вёсках.

З Акопаў мы проста паперліся ў цэнтр Еўропы, значыць, у мястэчка Сухаволя над рэчанькай Альшанкай. Чытач з Рэспублікі Беларусь мае права здзівіцца! Які зноў цэнтр Еўропы? Ён жа на Глыбоччыне, дакладна ля возера Шо, або, як хочуць у апошні час беларусы, у старажытным Полацку над Дзвіной. Так ці інакш, цэнтр у Сухаволі пазначаны на яцвяжскі манер, карацей, месца значыць масіўны валун. І вядомае яно ўжо з XVIII стагоддзя па прычыне каралеўскага картографа Антонія Сабірайскага.

* * *

Як немагчыма ўявіць лес без дрэў, так цяжка ўявіць сабе Сухаволю без мемарыяльнага музея ў гонар ксяндза Ежы Папялушкі. Сюды кіруюць першыя крокі ўсе турысты, якія прыязджаюць на айчыну бласлаўлёнага. Музей, а дакладней Ізба памяці кс. Ежы Папялушкі, знаходзіцца ў двухпавярховым, мураваным будынку на панадворку пялбаніі. Дзейнічае з 1985 года і сам сабой уяўляе візітную картачку мястэчка з сакольскім канём у гербе. Ужо з парога ўразіла нас адсутнасць у музеі г.зв. жыццёвага клею:

— Чаму тут няма здымкаў з Акопаў? — спытаў здзіўлены Зміцер Косцін.

— Відаць сямейка не хацела выстаўляцца ў Сухаволі? — падумала я ўголас. Вядома, мая заўвага была перабольшанай, бо ў Акопах мы пачулі, што іх не пытаюць пра дазвол на публічную прэзентацыю здымкаў ці выказванняў. Так ці інакш, адсутнасць роднай вёскі і „простых" ды яцвяжскіх дадаткаў, якія найхутчэй вырашалі пра свабодалюбівасць і бясстрашнасць бласлаўлёнага, кусаўся нам з ідэяй цэнтра Еўропы!

Зміцер Косцін і ксёндз Войцех

Згаданы камень, быццам вясёлка, ахінае жалезная канструкцыя, завершаная крыжам. Рэквізіт мае сакральную каштоўнасць, паколькі з'яўляецца ён элементам алтара на беластоцкім лётнішчы Крыўляны, якое ў 1991 годзе наведаў пасланец Рыма папа Ян Павел II. Канструкцыя і камень стаяць у парку ля манументальнага касцёла св. св. Пятра і Паўла і гэта таксама ўнушае думкі пра хрысціянскія місіі, Рым, цэнтры і яцвягаў...

Мы, зразумела, пайшлі за голасам сімвалаў проста ў касцёл славутых прапаведнікаў. За брамай нас прывітаў стэнд з паведамленнямі пра імшы, пілігрымкі і беатыфікацыю кс. Ежы Папялушкі 6 чэрвеня ў Варшаве. Лістоўка была пазначана здымкам пакутніка і лозунгам: „Był jednym z nas!" Некалькі крокаў далей мы сустрэлі сімвалічныя магілы ксяндзоў замардаваных камуністычнай бяспекай: Папялушкі і Сухавольца. На іх не было запаленых лямпачак ні прынесеных кветак, якія сведчылі б пра жывы культ магіл.

— Як выглядае ангажаванасць вернікаў у беатыфікацыю вашага земляка? — спыталі мы ў ксяндза Войцеха, з якім пазнаёміліся ўжо раней у Акопах. Сам ён мясцовы, з падсухавольскай вёскі Багны і сваіх прыхаджан ведае і разумее як самога сябе.

— Брыдка прызнацца, — пачулі мы ў адказ, — ale miejscowi są jakoś nieprzekonani, mówią, że nie mają czasu. Толькі нямногія прыйшлі дапамагчы, — уздыхае ксёндз і дадае: — Хутчэй як ад сваіх дачакаешся дапамогі ад людзей звонку! Nie wiem dlaczego tak do tego podchodzą...

Мы не здзівіліся адкрытасці нашага субяседніка, ужо раней мы пачулі падобныя нараканні ў Акопах. Хоць, як сказалі ў пачатку, яны былі жывым доказам біблейскай мудрасці пра прарокаў у родным краі. Інакш з гасцямі, хай яны і журналісты:

— To proszę się poczęstować, — да нас падышлі жанчыны і пачаставалі „апонкамі". Пончыкі смажылі яны вельмішаноўным візітантам, якія ў той самы час наведалі парафію і спажывалі абед на плябаніі.

Напярэдадні, значыць, паўтары тыдня да падзеі ў Варшаве, якая ў самой Сухаволі здавалася адлеглай і казачнай як мінулагодні снег...

(працяг будзе)

04.07 — 10.07

(22.03. — 20.04.) Вельмі добры настрой. Калі ты занядбоўваў цела, пачні над ім працаваць, хутка вернецца добрая форма. З 9.07. (да 13.07.) любоўныя поспехі. Сустрэнеш вельмі цікавых людзей, перажывеш рамантычныя хвіліны.

(21.04. — 21.05.) Нават у старой пары ажывуць гарачыя пачуцці. Хоць чакае цябе цяжкая праца, адчуеш сябе як рыба ў вадзе і будзеш за старанні ўзнагароджаны. 7-11.07. могуць стаць выклікам твае думкі пра людзей; зразумееш, што ў кожнага ёсць свае заганы.

(22.05. — 22.06.) Усе важныя справы афармляй да 10.07. З 9.07. (аж да 27.07.) нябярэш жвавасці, будзеш камунікатыўны, пераканальны, лёгка дагаворышся з іншымі; добры час на вучобу. Не страчвай запалу! Цікавымі задумамі трапіш у „10!"

(23.06. — 23.07.) Час 3-7.07. спрыяе фінансавым і прафесійным справам. Высілак і цярплівасць будуць узнагароджаны — з поспехам зрэалізуеш свае планы. Поўнае зацьменне Сонца ў тваім знаку (10-12.07.) ды Сатурн могуць выклікаць у табе неспакой і розныя апаскі, што не ўсё пойдзе па тваёй думцы. Патрактуй іх як падказку, што яшчэ трэба паправіць, каб дасягнуць поспеху.

(24.07. — 23.08.) 4-5.07. турбаваць цябе будуць благія ўспаміны; не мучся. З 9.07. (да 13.07.) — ініцыятыўнасць, прадпрымальнасць, адважныя і дынамічныя дзеянні. Адчыняцца перад табою закрытыя дагэтуль дзверы. Можаш пачаць рамонт у хаце.

(24.08. — 23.09.) Прытрапяцца табе незвычайныя сітуацыі, ды невыпадковыя. Перад табою прафесійныя поспехі, толькі свае планы ажыццяўляй з чуццём. Рабіць усё будзеш з энтузіязмам. Са здароўем добра, толькі больш варушыся і практыкуйся, каб пазбавіцца ад стрэсу.

(24.09. — 23.10.) Радасная цэлая першая дэкада. Унутраная раўнавага, аптымізм. Вельмі пільнуйся з канікульнымі планамі 7-11.07.; не карыстайся невядомымі прапановамі; доўгае падарожжа лепш адтэрмінуй. Могуць адазвацца твае ныркі і мачавы пухір.

(24.10. — 22.11.) Змена (хоць можа каштаваць многа нерваў) аздаровіць сітуацыю. Можаш разлічваць на шчаслівыя выпадкі, толькі ўмей іх выкарыстаць. Не памяншай сваіх заслуг Не зыходзь з абранага курсу, а калі адчуеш стому ці знеахвочанне, сцішыся і даўжэй адпачні.

(23.11. — 22.12.) Кіруйся інтуіцыяй (9-13.07.). Твае высілкі не пойдуць упустую. Будзь цярплівым. У пары паразмаўляй пра адкладваныя, непрыемныя справы. Спалучыш агонь з вадою: і адпачнеш, і заробіш на павышэнне.

(23.12. — 20.01.) Трымайся плана, а ўсё пойдзе лепш чым думаеш. Не купляй за пазычанае лішніх рэчаў. 7-11.07. можа аднавіцца старое знаёмства. Ва ўікэнд не дамаўляйся на важныя сустрэчы; пагадненні не ўтрымаюцца. Паспяховыя выпадкі для душы і цела.

(21.01. — 19.02.) Вакол цябе прыязныя людзі, шчасце і ў каханні (яму паможаш цярплівасцю, нічога не прыспешвай). З 8.07. (да 12.07.) нечакана зменіш свае планы, і будзе гэта табе ў карысць. Пазнаёмішся з кімсьці, хто паможа табе палапацца ў нейкай складанай справе. Пазбягай салодкага і кулінарных эксперыментаў.

(20.02. — 21.03.) З 7.07. (да 13.07.) добра бачацца твае экзамены і публічныя выступленні. 10-12.07. (зацьменне Сонца) нядобра прадбачвае для летніх раманаў і фліртаў (9-13.07. — будзь вельмі асцярожным у пачуццях; не пераймайся, калі пачастуюць цябе гарбузом!). Неспадзяваныя падзеі прымусяць цябе быць гнуткім дыпламатам.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960